ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Дзень, калі падлетак зарабіў першы ў сваім жыцці «рубель», запамінаецца назаўсёды. Аднак кудысьці ўладкавацца 14-гадоваму школьніку даволі складана.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына НАРКЕВІЧ, намеснік міністра гандлю:

«Сёння, згодна з дзеючым заканадаўствам, гаражны кааператыў (месца ў гаражным кааператыве, гараж) можа служыць толькі для захоўвання аўтамабіля. Зараз мы фармулюем падыход, каб гэты кааператыў выкарыстоўваўся не толькі для захоўвання аўто, але каб у ім таксама можна было займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, атрымаўшы адпаведныя дазволы — у тым ліку ад падатковых органаў, Міністэрства аховы здароўя, Дзяржстандарту».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 1°
Віцебск	– 7°
Гомель	– 2°
Гродна	– 3°
Магілёў	– 5°
Мінск	– 5°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.03.2013 г.

Долар ЗША	8600,00 ■
Еўра	11100,00 ▼
Рас. руб.	278,00 ▼
Укр. грыўня	1057,49 ▼

■ Падпіска 2013

ДА ЧЫТАЧА!

У Мінскай вобласці дзень 22 сакавіка аб'яўлены Днём падпісчыка.

Як заўсёды, удзел у ім бярэ і «Звязда». Прынамсі, для таго, каб расказаць пра газету, каб адказаць на пытанні, каб кожнаму, хто падпішацца, уручыць памятныя падарункі, а самаму першаму падпісчыку — фірменны звяздоўскі штотыднёвік, супрацоўнікі рэдакцыі выязджаюць у **Барысаў, Дзяржынск і Жодзіна**. Там, у **раённых вузлах пашtовай сувязі,** яны будуць чакаць чытачоў **з 11 да 14 гадзін**. Так што прыходзьце!

І, безумоўна ж, выпісвайце — адзіную, штодзённую беларускамоўную... Родную газету на роднай мове!

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

21 САКАВІКА 2013 г. ЧАЦВЕР № 52 (27417) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АСТРАНАМІЧНЫЯ ШАЛІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Беларусь прыйшла астранамічная вясна. Гэты дзень называецца таксама днём вясновага раўнадзенства, бо даўжыня дня роўная даўжыні ночы. Экватар паміж цемрай і святлом. Раўнавага на планетарных шалях. Сталічныя школьнікі (на фота) радуюцца і надыходу сапраўднай вясны, і шчодраму сонцу, і блакітнаму небу. А яшчэ больш — хуткаму набліжэнню вясновых канікулаў.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ДЗЕЛЯ ТАКІХ ПЛАНАЎ ВАРТА БЫЛО ЕХАЦЬ ТАК ДАЛЁКА»

Сёння Прэзідэнт Беларусі правядзе перамовы з Прэзідэнтам Сінгапура Тоні Тан Кенг Ямам і сустрэнецца з прэм'ер-міністрам гэтай краіны Лі Сянь Лунам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Члены афіцыйнай беларускай дэлегацыі ў гэтыя дні правядуць шэраг двухбаковых сустрэч і перамоваў з сінгапурскімі калегамі, прымуць удзел у Беларуска-сінгапурскім бізнэс-форуме.

Учора ж Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Сінгапуры з прэзідэнтам холдынгавай кампаніі «Рыяда Груп» Шэйхай Дэяй бінт Ібрахім Аль-Халіфой абмеркаваў планы па сумеснай працы, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Трэба было ехаць на край свету, каб сустрэцца тут і абмеркаваць наша пытанне, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але наколькі я інфармаваны аб нашых сумесных планах, то дзеля іх рэалізацыі варта было ехаць так далёка».

Шэйха Дэя бінт Ібрахім Аль-Халіфа ў сваю чаргу адзначыла, што існуе шэраг канкрэтных планаў, якія неабходна завяршыць. «Мы сцісла абмеркавалі з Уладзімірам Сямашкам, першым віцэ-прэм'ерам Беларусі, магчымасці нашага сумеснага супрацоўніцтва, у прыватнасці арганізацыю вытворчасці і пачатак сумеснай працы», — сказала яна.

Беларусь зацікаўлена ў асваенні новых рынкаў збыту сваёй прадукцыі. У сувязі з гэтым усталяванне кантактаў з кампаніяй «Рыяда Груп», якая з'яўляецца адной з найбуйнейшых у краінах Персідскага Заліва і Блізкага Усходу, уяўляе для беларускай дзяржавы значную цікавасць.

СТАР. 2

ДАРЭЧЫ

Заяўкі на ўдзел у IX Нацыянальным конкурсе друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая Літара» прымаюцца да 10 красавіка, паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі. Да ўдзелу запрашаюцца друкаваныя СМІ, інфармацыйныя агенцтвы, зарэгістраваныя ў Беларусі, а таксама асобныя аўтары — па прадстаўленні друкаванага СМІ або інфармацыйнага агенцтва. Падрабязнасці на сайце Міністэрства інфармацыі — www.mininform.gov.by.

■ Радар

ВА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ДАРОЖНАГА РУХУ ШТОСЬЦІ З... САМААЦЭНКАЙ

У бліжэйшым часе плануецца прыняць закон, які прадугледжвае больш жорсткае, чым раней, пакаранне за кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення. Калі закон будзе прыняты, істотна павялічацца не толькі тэрміны пакарання па крымінальных справах, але больш адчувальнымі стануць памеры штрафаў за падобныя правапарушэнні. Праект вышэйзгаданага дакумента прапануе і канфіскацыю транспартнага сродку ў тых вадзіцеляў, якія паўторна на працягу аднаго года селі за руль у нецвярозым стане. Калі п'яны вадзіцель трапіць у поле зроку ДАІ першы раз, яго аўтамабіль будзе размешчаны на стаянку, якая ахоўваецца, да моманту поўнай аплаты штрафу.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Начальнік упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Юрый ЛІТВІН.

СТАР 4

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

РАСПЛАТА НЕ АБМІНУЛА КАРНІКАЎ

22 сакавіка стаў у Беларусі днём жалобы. Хатынь увайшла ў чорную кнігу трагедый гісторыі чалавецтва і вядома ўсяму свету. Але нават у нас у краіне мала хто ведае, што рэканструкцыя многіх раней невядомых абставін хатынскай трагедыі, выяўленне катаў Хатыні і ўстанаўленне ролі кожнага з іх у расправе з вяскоўцамі, а таксама заслужанае пакаранне карнікаў сталі магчымымі дзякуючы карпатлівай рабоце гродзенскіх следчых. Праз дзясяткі гадоў адплата насцігла семярых злачынцаў, якія, пераапрануўшыся ў авечую скуру, жылі сабе ў СССР.

У СССР да расследавання хатынскай трагедыі прыступілі толькі праз 30 гадоў. Чаму?

У канцы 60-х, праз чвэрць стагоддзя пасля заканчэння Другой сусветнай вайны, было ўзнята пытанне аб спыненні прыцягнення да крымінальнай адказнасці нацыстаў па сканчэнні тэрміну даўнасці. Прадстаўнік бундэстага ФРГ агучыў гэтыя настроі на генеральнай сесіі ААН. Міністр замежных спраў СССР Андрэй Грамыка, спаслаўшыся на Нюрнберг, заявіў тады, што фашысцкім злачынствам няма прабачэння. Сесія прыняла рашэнне: усім еўрапейскім дзяржавам падрыхтаваць афіцыйныя дакументы, якія пацвярджаюць злачынствы нацыстаў. Савецкі ўрад даручыў пракуратуры і Камітэту дзяржаўнай бяспекі заняцца выяўленнем канкрэтных фактаў масавага знішчэння мірнага насельніцтва.

СТАР 3

«ДЗЕЛЯ ТАКІХ ПЛАНАЎ ВАРТА БЫЛО ЕХАЦЬ ТАК ДАЛЁКА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У канцы 2012 года прадстаўнікі «Рыяда Груп» наведвалі Беларусь, вывучаючы магчымасці пастаўкі прадукцыі буйных беларускіх прадпрыемстваў па дагаворах міжнароднага лізінгу з выкарыстаннем ісламскага фінансавання з боку кампаніі «Рыяда Груп». У прыватнасці, плануюцца пастаўкі прадукцыі Мінскага аўтамабільнага завода, Беларускага аўтамабільнага завода, ААТ «Амкадор», «Белкамунмаша», арганізацыя зборкі пасажырскай тэхнікі ў Амане, сумесных прадпрыемстваў па вытворчасці прадуктаў харчавання. Акрамя таго, «Рыяда Груп» выказвае зацікаўленасць у прыцягненні ВА «Беларусьнафта» да ўдзелу ў нафтагазавых праектах на Блізкім Усходзе.

Шэйха Дэя бінт Ібрахім Аль-Халіфа звязана з кіраваннем больш чым 30 сумеснымі прадпрыемствамі на тэрыторыі Блізкага Усходу, Паўночнай Афрыкі, Еўропы. З'яўляецца членам каралеўскай сям'і Бахрэйна.

Дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Сінгапурам устаноўлены ў 1992 годзе. Аснову беларускага экспарту ў Сінгапур складае прадукцыя ААТ «Белшына». Упершыню за апошнія чатыры гады ажыццёўлены пастаўкі дроту з нелегіраванай сталі. На 10% вырас экспарт электронных інтэгральных схем. З 2006 года ў Сінгапуры функцыянуе рэгіянальнае прадстаўніцтва ЗАТ «БКК», з 2009 года — гандлёвы дом ААТ «Белшына» («Белтайер Эйша»), з 2011-га — гандлёвы дом ААТ «БелАЗ» («Белазія»). У 2012 годзе ў Сінгапур для далейшага рээкспарту ў іншыя краіны Азіі было пастаўлена 45 трактароў вытворчасці «МТЗ» на суму $0,7 млн.

Асноўнымі артыкуламі імпарту ў Беларусь з'яўляюцца камп'ютарная тэхніка, электратавары, радыёапаратура, медыцынскае абсталяванне, тавары народнага спажывання.

У 2012 годзе аб'ём сінгапурскіх інвестыцый у эканоміку Беларусі склаў $730 тысяч.

ГАЗ «ПАДДАЎ» У ЦАНЕ

З сённяшняга дня ў краіне павялічваюцца цэны на звадкаваны газ для камунальна-бытавога спажывання арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Такое рашэнне прынята пастановай Міністэрства эканомікі.

У адпаведнасці з дакументам, цэны на газы вуглевадародныя звадкаваныя паліўныя для камунальна-бытавога спажывання, што рэалізуюцца арганізацыям, якія ўваходзяць у склад дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз», на ўмовах «франка-адпраўленне» павялічыліся з Br 1 370 940 да Br 1 388 490 за тону, а на ўмовах «франка-склад арганізацыі-вытворцы» — з Br 1 366 780 да Br 1 384 270 за тону. Адпускная цана на газы вуглевадародныя звадкаваныя паліўныя для камунальна-бытавога спажывання, што рэалізуюцца арганізацыям, якія не ўваходзяць у «Белпалівагаз», на ўмовах «франка-адпраўленне» і «франка-склад арганізацыі-вытворцы» фарміруюцца з улікам рынкавай кан'юнктуры. Таксама адпускная цана на газы вуглевадародныя звадкаваныя паліўныя для камунальна-бытавога спажывання для запраўкі ў балоны, што рэалізуюцца юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, на ўмовах «франка-склад арганізацыі-вытворцы» павялічылася з Br 1 445 040 да Br 1 463 540. У сярэднім цэны павялічыліся на 1,26 працэнта.

Нагадаем, што да гэтага апошняе падаражанне звадкаванага газу адбылося 9 лютага. Тады дзейныя гранічныя максімальныя адпускныя цэны на газы вуглевадародныя звадкаваныя паліўныя для камунальна-бытавога спажывання павялічыліся на 2,6 працэнта. На газы вуглевадародныя звадкаваныя паліўныя для аўтамабільнага транспарту — на 8,5 працэнта. Дзейныя гранічныя рознічныя цэны на звадкаваны газ, што рэалізуецца на аўтамабільных заправачных станцыях, павялічыліся тады на 8,5 працэнта. А цэны на звадкаваны газ, які рэалізуецца насельніцтву ў малалітражных балонах (ад 1 да 27 літраў), павялічыліся на 4,8 працэнта.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Госці, госці, госці...

ЗАМЕЖНІКАМ — НАЧЛЕГ, СТУДЭНТАМ — ПРАЦА

Персанал для працы ў часовых гасцініцах, ролю якіх на перыяд правядзення чэмпіянату свету па хакеі — 2014 будуць выконваць 12 студэнцкіх інтэрнатаў, гарадскія ўлады плануюць набіраць з ліку супрацоўнікаў інтэрнатаў і студэнтаў.

— Для таго, каб забяспечыць часовыя гасцініцы персаналам, спатрэбіцца крыху больш за тысячу чалавек. З іх 72 чалавекі — адміністрацыйны персанал, у ролі якога будуць супрацоўнікі інтэрнатаў — каменданты і выхавацелі. Для гэтых людзей будуць праводзіць навучальныя семінары, каб на працягу амаль двух месяцаў лягчэй было кіраваць установай, якая часова набудзе статус гасцініцы, — паведаміў журналістам начальнік дзяржустановы «Упраўленне бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва» Мінгарвыканкама Андрэй Новікаў падчас прэс-канферэнцыі.

Што датычыцца астатняга персаналу, то зараз разглядаецца магчымасць сфарміраваць яго са студэнтаў тых навучальных устаноў, да якіх адносяцца інтэрнаты. Тлумачыць ім нюансы працы будуць непасрэдна перад чэмпіянатам свету — са студзеня па красавік 2014 года. Каб забраніраваць нумар у гасцініцы, іншаземцам давядзецца звярнуцца ў адзіны цэнтр браніравання, які створаць на базе дзяржаўнай установы «ЦэнтрКурорт». З усіх інтэрнатаў, куды будуць сяліць балельшчыкаў, што прыедуць на чэмпіянат свету, 40 працэнтаў знаходзяцца ў стадыі рэканструкцыі, рамонту альбо будаўніцтва. Здаць іх у эксплуатацыю патрэбна да снежня 2013 года, таму, па словах Андрэя Новікава, мэтазгодна будзе да турыстаў нікога туды не засяляць.

Хостэлы, гэтак жа, як і часовыя гасцініцы на базе студэнцкіх інтэрнатаў, — таксама досыць прымальны для замежнікаў варыянт.

— У сталіцы цяпер дзейнічае 8 хостэлаў, у якіх каля 400 месцаў. На працягу 2012 года яны актыўна адкрываліся і ніякай падтрымкі ад дзяржавы ці ад Мінгарвыканкама не патрабавалі, таму можна зрабіць выснову, што гэты від гасцініц карыстаецца попытам, — адзначыў Андрэй Новікаў.

Сёння ў Мінску працуе 27 гасцініц рознай коштавай катэгорыі, у тым ліку — дзве гасцініцы ўзроўню «пяць зорак» і дзве — «чатырохзоркавыя». Падчас чэмпіянату свету па хакеі ў сталіцу прыедзе каля 20 тысяч чалавек. Каб іх рассяліць, выкарыстоўваць збіраюцца 33 гасцініцы, з якіх зараз працуюць 22. Новых аб'ектаў будзе 11. Іх плануецца ўвесці ў эксплуатацыю сёлета да канца года. Гэта, напрыклад, гасцініца «Вікторыя», комплекс будынкаў Нацыянальнага алімпійскага камітэта, гасцініца на вуліцы Замкавай, а таксама — на месцы былога манастыра бернардзінцаў, гасцініца «Беларусь», якая адкрыецца пасля рэканструкцыі. Завершаць працу над «Славянскай» і «Пекінам», а на перасячэнні вуліц Нарачанскай і Ціміразева, на вуліцах Кашавога і Каржанеўскага, паблізу Парка высокіх тэхналогій, зараз будуюцца 4 бюджэтныя гасцінічныя комплексы.

Ганна ГАРУСТОВІЧ ■

■ Ну і ну!

За абразу ў інтэрнэце — 500 тысяч!

— А ўсё пачалося з канфлікту ў рэстаране, дзе гэты мужчына быў са сваёй дамай. Адбыўся канфлікт, удзельніцамі якога сталі спадарожніца «галоўнага героя» і пацярпелая — работнік рэстарана, — расказвае **Андрэй МЛЕЧКА, памочнік пракурора Кастрычніцкага раёна Віцебска**. — Нават дайшла справа да суда, дзе разбіралі канфлікт. Паколькі на судовым пасяджэнні было агучана прозвішча пацярпелай, мужчына без праблем знайшоў старонку дзяўчыны ў сацыяльным сеціве і адправіў ёй, скажам так, непрыемны ліст. Дзяўчына звярнулася па дапамогу ў міліцыю і папрасіла прыцягнуць мужчыну да адказнасці за абразы.

У выніку адбыўся суд, пастановай якога абражальнік быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці: яго аштрафавалі на 5 базавых велічынь.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Опій на гарышчы

Оперупаўнаважаныя аддзялення наркакантролю і процідзеяння гандлю людзьмі Першамайскага РУУС сталіцы затрымалі 28-гадовага мінчаніна, які на гарышчы ўладкаваў месца для вырошчвання... наркатычных рэчываў.

— На верхнім тэхнічным паверсе шматпавярхоўкі ён вырашыў абсталяваць месца для вырабу опію, — паведаміла **прэс-сакратар Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга Куцько.** — На гарышча ён правёў электрычнасць, павесіў лямпачку і ўстанавіў электраплітку. Затрымалі грамадзяніна падчас вырабу чарговай «дозы». Пры агляндзе месца супрацоўнікі міліцыі знайшлі прыстасаванне для варкі опію, насенне маку, сумесь для курэння і 90 таблетак трамадолу. Зараз мужчына знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання.

Сяргей РАСОЛЬКА ■

БЕЛАРУСКІ ІНТАРЭС У СІНГАПУРЫ

Сінгапур можа ўзяць удзел у набыцці беларускіх каштоўных папер, адкрыць філіял аднаго са сваіх банкаў на нашай тэрыторыі, падзяліцца інавацыямі ў сферы вядзення фінансавай і інвестыцыйнай дзейнасці.

Абмяркоўваючы дасягненні Сінгапура, большасці каментатараў цяжка ўтрымацца ад эпітэтаў «лепшы», «выдатны», «унікальны». Для гэтага ёсць усе падставы. У сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя Сінгапур быў тыповай краінай Паўднёва-Усходняй Азіі — з нізкім узроўнем жыцця, большасцю насельніцтва ў трушчобах, высокай злачыннасцю і карупцыяй, міжэтнічнымі і міжрэлігійнымі сутыкненнямі. Сёння ён стаў недасяжным лідарам Паўднёва-Усходняй Азіі па ўзроўні жыцця насельніцтва, ступені развітасці эканомікі, забеспячэння міжэтнічнага і міжрэлігійнага міру і гармоніі, эфектыўнасці барацьбы са злачыннасцю і карупцыяй. Некалькі гадоў назад Сінгапур разам са Швейцарыяй узначаліў адзін з сусветных рэйтынгаў па памеры актываў, што прыпадаюць на адну сям'ю ў краіне. Адзначым, што ў рэйтынгу глабальнай канкурэнтаздольнасці Сінгапур таксама на працягу апошніх гадоў займае другое месца (пасля Швейцарыі). Пры гэтым Сінгапур традыцыйна з'яўляецца лідарам у сусветным рэйтынгу «Вядзенне бізнэсу», які вызначае ступень спрыяльнасці вядзенню камерцыйнай дзейнасці ў краіне. Па памеры ВУП Сінгапур таксама адзін з першых у рэгіёне, паколькі, нягледзячы на тое, што ў ім пражывае крыху больш як пяць мільёнаў чалавек, аб'ём нацыянальнай эканомікі перавышае 320 мільярдаў долараў. Пры гэтым сама тэрыторыя краіны складае ўсяго 710 кв. кіламетраў, што менш за тэрыторыю Беларусі ў 292 разы.

Закласці асновы такой неверагоднай трансфармацыі змог нацыянальны лідар Лі Куан Ю, які стаў прэм'ер-міністрам краіны ў 1959 годзе. Таму папулярнасць Лі Куан Ю ў краіне проста неверагодная, і не дзіўна, што цяпер прэм'ер-міністрам з'яўляецца яго сын, Лі Сянь Лун.

Сінгапур найбольш прывабны для Беларусі як адзін з самых магутных у свеце фінансавых і інвестыцыйных цэнтраў. Адзначым, што сёння па памеры золатавалютных рэсурсаў Сінгапур знаходзіцца на 11 месцы ў свеце з 259 мільярдамі долараў, апярэджваючы такія вялізныя краіны, як Германія, Францыя, Італія і ЗША. У прыватнасці, менавіта інвестыцыі з Сінгапура адыгралі значную ролю ў паспяховай мадэрнізацыі Кітая. Гэта і не дзіўна, улічваючы, што тры чвэрці насельніцтва Сінгапура — этнічныя кітайцы. Сінгапур можа ўзяць удзел у набыцці беларускіх каштоўных папер, адкрыць філіял аднаго са сваіх банкаў на нашай тэрыторыі, падзяліцца інавацыямі ў сферы вядзення фінансавай і інвестыцыйнай дзейнасці.

Пры гэтым інвестыцыі з Сінгапура часта спалучаюцца з найноўшымі тэхналогіямі, што таксама вельмі важна для нашай краіны. У спісе найбуйнейшых па капіталізацыі 500 транснацыянальных карпарацый (ТНК) свету ў 2010 годзе ў Сінгапура налічвалася 6 ТНК. Беларускі інтарэс у гэтай сферы звязаны ў тым ліку са стварэннем і развіццём Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка. Як вядома, асноўныя кірункі яго дзейнасці — стварэнне і развіццё вытворчасцяў у сферах электронікі, тонкай хіміі, біятэхналогій, машынабудавання і новых матэрыялаў. У гэтай сферы ў Сінгапура мноства пачынанняў. У яго таварным экспарце прамысловыя тавары складаюць амаль тры чвэрці.

Сур'ёзныя перспектывы магчымыя і ў супрацоўніцтве ў сферы фармацэўтыкі. На тэрыторыі Сінгапура размешчаны заводы найбуйнейшых фармацэўтычных кампаній свету і экспарт фармацэўтычных тавараў з'яўляецца адным з галоўных экспартных артыкулаў. Для Беларусі развіццё гэтага кірунку эканамічнай дзейнасці — адзін з найбольш прыярытэтных.

Павучальны і вопыт Сінгапура ў сусветным гандлі. Па выніках 2010 года гэта невялікая па насельніцтве краіна стала сусветным экспарцёрам № 14 і сусветным імпарцёрам № 15 сярод усіх краін свету. Яе доля ў сусветным экспарце склала 2,31 працэнта. Як вядома, Беларусь з'яўляецца адной з найбольш экспартаарыентаваных краін Еўропы, і ад далейшых поспехаў на гэтым кірунку залежыць эфектыўнасць мадэрнізацыі эканомікі і рост дабрабыту насельніцтва. Асаблівы інтарэс для Беларусі мае вопыт Сінгапура ў арганізацыі экспарту паслуг. Па выніках 2010 года Сінгапур змог ажыццявіць экспарт паслуг амаль на 112 мільярдаў долараў, што ў шмат разоў перавышае беларускі паказчык. Нацэленасць Беларусі ў апошнія гады менавіта на развіццё экспарту паслуг, які традыцыйна для нашай краіны мае дадатнае сальда, перавышаючы імпарт паслуг, робіць досвед Сінгапура ў гэтай сферы важным для нас.

Варта павучыцца ў Сінгапура і здольнасці дыверсіфікаваць свой экспарт. У гэты момант асноўныя патокі экспарту прыкладна ў роўным аб'ёме размяркоўваюцца паміж Малайзіяй, Ганконгам, Кітаем, Еўрапейскім саюзам і Інданезіяй. Адпаведна, краіна з'яўляецца менш уразлівай да праблем на тым або іншым рынку. У Беларусі сёння асноўны экспарт сканцэнтраваны ўсяго на двух рынках — Еўрапейскім саюзе і Расіі, што больш рызыкоўна. Безумоўна, тут мае значэнне і адсутнасць у Беларусі выхаду да Сусветнага акіяна, але неабходнасць дыверсіфікацыі экспарту па ўзоры Сінгапура відавочная.

Можна чакаць, што візіт Прэзідэнта Беларусі ў Сінгапур з прадстаўнічай урадавай дэлегацыяй паслужыць усталяванню доўгачасовых і ўзаемавыгадных дзелавых і палітычных адносін.

Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Лапеку Ігару Дзмітрыевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

РАСПЛАТА НЕ АБМІНУЛА КАРНІКАЎ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Так у 1972 г. упраўленне КДБ па Гродзенскай вобласці атрымала ад Юрыя Андропава асабліва важнае заданне — расследаваць злачынствы, учыненыя ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі карнікамі 118-га паліцэйскага батальёна. Чаму менавіта гродзенскія следчыя атрымалі гэтае заданне? 118-ы батальён у снежні 1942—ліпені 1943 г. удзельнічаў у карных аперацыях супраць партызанаў і мірнага насельніцтва на тэрыторыі Мінскай вобласці, а ў ліпені 1943—ліпені 1944 г. — на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

Маёр Я.М. Далідовіч працуе са справай карнікаў Хатыні, 1973 г.

Гродзенскія следчыя заселі ў беларускіх архівах, рабілі запыты ў архівы іншых рэспублік. Даследавалі матэрыялы Надзвычайных камісій па расследаванні злачынстваў гітлераўцаў. Вывучалі трафейныя дакументы на нямецкай мове. Аналізавалі крымінальныя і фільтрацыйныя справы на людзей, што служылі ў карных фарміраваннях гітлераўцаў. Дапытвалі былых паліцэйскіх 118-га батальёна, якія ўжо былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Апытвалі жыхароў населеных пунктаў, дзе дыслацыраваліся падраздзяленні гэтага батальёна.

❑❑❑

У аператыўна-пошукавай групе працаваў следчы Яўген Мікалаевіч Далідовіч, ветэран Вялікай Айчыннай вайны (пазней, у 1990-я — 2000-я гады, ён працаваў выкладчыкам кафедры крымінальнага права, працэса і крыміналістыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, загадчыкам лабараторыі тэхніка-крыміналістычных сродкаў, намеснікам дэкана юрыдычнага факультэта. Цяпер — ганаровы член ветэранскай арганізацыі ўніверсітэта). Яўген Мікалаевіч не па фільмах ведае жорсткі твар вайны. Яго вёска Блашчытнікі (у Пухавіцкім раёне Мінскай вобласці) знаходзілася ў зоне партызанскага руху. Партызанам патрэбна была майстэрня па рамонце зброі, і ўзяцца за такую няпростую справу даручылі Мікалаю Далідовічу, бацьку Яўгена. Майстэрню ён уладкаваў на ўскраіне вёскі ў мураваным склепе. Пад покрывам ночы разам са сваімі сынамі, старэйшым Георгіем і малодшым Яўгенам, на конных павозках тайна звозіў туды кавальскі і слясарны інструмент з мясцовых машынна-трактарных станцый. Разам яны рамантавалі зброю, выраблялі выбуховыя прыстасаванні для рэйкавай вайны, падкоўвалі коней, акоўвалі сёдлы для кавалерыі.

З мая 1943 г. да канца вайны Яўген быў сувязным партызанскага атрада імя Шчорса 3-й Мінскай брыгады імя Будзённага. Бацьку ў ліпені 1944 г. з партызанскага атрада прызвалі на фронт, ён загінуў на тэрыторыі Польшчы. Імя Мікалая Далідовіча ўнесена ў спіс польскай кнігі «Памяць».

Пасля вайны Яўген сумяшчаў вучобу ў школе з працай у калгасе кавалём і памочнікам механіка па сельгастэхніцы. У хуткім часе яму прапанавалі працу архіварыуса ў аддзеле нямецкіх трафейных дакументаў Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці.

Архіварыусам Яўген працаваў у першай палове дня. У другой — вучыўся на вячэрнім патоку тэхнікума. Дакументаў у аддзел Яўгена паступала вельмі шмат, і разбірацца ў іх змесце часу не было. Тады ён і падумаць не мог, што пазней адзін з гэтых дакументаў (справаздача з данясеннем Плешчаніцкага куста (аддзела) жандармерыі Барысаўскаму акруговаму гебітскамісарыяту аб акцыях супраць партызанаў і мясцовага насельніцтва, праведзеных паліцыяй, гестапа, СД і жандармерыяй на тэрыторыі Плешчаніцкага і суседніх раёнаў у першай палове 1943 г.) дапаможа раскрыць адну са страшных таямніц беларускай гісторыі часоў апошняй вайны — даказаць факт спалення Хатыні 118-м украінскім паліцэйскім батальёнам.

У 1954—1957 гадах ён працаваў народным следчым у пракуратуры Плешчаніцкага раёна і старшым следчым Бягомльскай міжрайпракуратуры Мінскай вобласці, гэта значыць, у тых мясцінах, дзе трохі больш за дзесяцігоддзе да таго лютаваў 118-ы карны батальён. Неаднойчы з Плешчаніц хадзіў у Хатынь, бачыў зарослыя рэшткі папялішча, напаўразбураныя коміны пячэй, якія ўзвышаліся над бур'яном. Зноў-такі, малады следчы не мог тады прадбачыць, што яму выпадзе лёс вышукваць хатынскіх катаў і даказваць факты іх злачынстваў.

❑❑❑

І вось у 1972—1973 гадах аператыўна-пошукавая група па намечаным плане пачала расследаванне справы хатынскіх карнікаў. Разам з маёрам, а потым падпалкоўнікам Я. М. Далідовічам працавалі старшыя следчыя па асабліва важных справах Упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці Віктар Філіпавіч Макарчыкаў і Фёдар Фадзеевіч Драздоў, які пазней быў выкладчыкам кафедры грамадзянскага права і працэса ГрДУ імя Янкі Купалы.

Спачатку здавалася, успамінае Я.М. Далідовіч, што іх следчая работа не магла мець судовай перспектывы. Шмат хто з паліцэйскіх, пацярпелых, сведкаў ужо памерлі. Тыя, хто засталіся ў жывых, наўрад ці маглі праз 25 з лішкам гадоў пасля вайны дакладна аднавіць у памяці падзеі мінулага, хай сабе і такія, што цяжка забыць. Аднак доўгая і старанная праца следчых дала вынік.

Следства рэканструявала па днях, а часам і па гадзінах гісторыю і шлях па Беларусі карнікаў 118-га паліцэйскага батальёна, вяхамі якога былі трупы і папялішчы. Устанавілі, што 118-ты батальён быў сфарміраваны нямецка-фашысцкімі акупантамі ў

Штогод мясцовыя піянеры... віншавалі «ветэрана» Вялікай Айчыннай вайны з Днём Перамогі! Кіеўскае інжынернае вучылішча запісала свайго даваеннага выпускніка ў ганаровыя курсанты. Ніхто і падумаць не мог, што ён быў адным з асноўных фігурантаў Хатынскай трагедыі — карнікам.

пачатку красавіка 1942 г. у Кіеве на базе 115-га ўкраінскага паліцэйскага батальёна і асобнай паліцэйскай роты, што дыслацыравалася ў г. Шпола Чаркаскай вобласці. Асабовы састаў 118-га батальёна фарміраваўся з добраахвотнікаў, у асноўным ураджэнцаў і жыхароў Букавіны і іншых заходніх абласцей Украіны, а таксама з ліку ваеннапалонных, што здрадзілі Радзіме, і значыліся па дакументах як асобы ўкраінскага паходжання. Усе яны прынялі прысягу на вернасць фашысцкай Германіі, атрымалі зброю і ваенную форму рыжага колеру з запасаў арміі буржуазнай Латвіі. Арганізатарам і камандзірам батальёна з'яўляўся нацыст, маёр ахоўнай паліцыі Эрых Кёрнер.

17 кастрычніка 1942 г. батальён разам з іншымі нямецкімі фарміраваннямі ўдзельнічаў у карнай аперацыі супраць савецкіх партызанаў у Мінскім, Шчорсаўскім і Галаднянскім раёнах Чарнігаўскай вобласці, а ў канцы лістапада быў перадыслацыраваны ў Беларусь.

Гродзенскія следчыя раскрылі жахлівыя падрабязнасці дзейнасці 118-га батальёна, яго ўдзел у карных аперацыях «Котбус» на тэрыторыі Докшыцкага, Лагойскага і Барысаўскага раёнаў, «Герман» у Налібоцкай пушчы на тэрыторыі Навагрудскага, Іўеўскага і Карэліцкага, Стаўбцоўскага і Валожынскага раёнаў, «Вандсберг» у Ліпічанскай пушчы на тэрыторыі Мастоўскага, Ваўкавыскага, Слонімскага і Дзятлаўскага раёнаў.

Вось тады Я.М. Далідовіч і выйшаў на згаданае вышэй данясенне Плешчаніцкай жандармерыі Барысаўскаму гебітскамісарыяту аб сваёй дзейнасці за студзень—май 1943 г. Нямецкая мова, гатычны шрыфт. Але выразна чыталася: 22 сакавіка, Хатынь, 118-ты шуцманшафтбаталь. Так быў даказаны факт яго ўдзелу ў спаленні вёскі.

Адно за адным органамі дзяржбяспекі выяўляліся імёны ваенных злачынцаў, якія пазбеглі пакарання. Іх выкрывалі паказаннямі сведкаў, пратаколамі агляду месцаў масавага знішчэння людзей...

❑❑❑

У 1973 г. на лаву падсудных селі пяцёра карнікаў са 118-га батальёна.

У ходзе следства высветлілася яшчэ адно імя ваеннага злачынцы — Мялешкі, які служыў у 118-м карным батальёне на камандных пасадах. Зноў узяліся за працу гродзенскія следчыя. У лістападзе—снежні 1986 г. ваенны трыбунал Беларусі разгледзеў справу па абвінавачванні здрадніка Мялешкі, і яшчэ адзін паліцай атрымаў заслужанае пакаранне.

Апошняй была ўстаноўлена асоба аднаго з галоўных катаў Хатыні — Рыгора Васюры. Былы афіцэр Чырвонай арміі, які добраахвотна перайшоў на службу да фашыстаў, займаў са снежня 1942 г. па ліпень 1944 г. пасаду начальніка штаба 118-га паліцэйскага батальёна. Менавіта Васюра разам з шэфам батальёна гітлераўскім афіцэрам Кёрнерам, разгарнуўшы ў ланцуг 300 карнікаў, кіраваў акружэннем Хатыні і расправай над яе жыхарамі. Гэта ён разам з Мялешкам даваў падпарадкаваным карнікам каманды знішчаць Хатынь і яе 149 жыхароў, з якіх палова (75) былі дзеці.

На лаве падсудных у 1986 г. сядзеў 70-гадовы стары. Пасля вайны Васюра трапіў у фільтрацыйны лагер. У 1952 г. за супрацоўніцтва з фашыстамі быў асуджаны трыбуналам Кіеўскай ваеннай акругі да 25 гадоў пазбаўлення волі. Праз 3 гады выйшаў на волю па амністыі. Сваю карную дзейнасць ён тады ўтаіў.

Вярнуўся дахаты, у Кіеўскую вобласць, працаваў аграномам, потым намеснікам дырэктара саўгаса. Рэгулярна атрымліваў граматы за вытворчыя поспехі, быў паважаны начальствам. Штогод мясцовыя піянеры... віншавалі «ветэрана» Вялікай Айчыннай вайны з Днём Перамогі! Кіеўскае інжынернае вучылішча запісала свайго даваеннага выпускніка ў ганаровыя курсанты. Ніхто і падумаць не мог, што ён быў адным з асноўных фігурантаў Хатынскай трагедыі — карнікам.

27 гадоў таму хатынскі кат панёс заслужанае пакаранне. Так хацелася б напісаць: апошні хатынскі кат. На жаль, не...

Адзін з іх, Уладзімір Катрук, і сёння жыве ў Канадзе, яму 91 год, ён разводзіць пчол. Летась яго вылічыў Цэнтр Сімона Візенталя, які займаецца вышукам па ўсім свеце нацысцкіх злачынцаў, якія засталіся ў жывых. Задача камандзіра ўзвода 118-га паліцэйскага батальёна Катрука падчас карнай акцыі ў Хатыні заключалася ў ліквідацыі вяскоўцаў, якія намагаліся ўцячы ад немінучай смерці. Разам з батальёнам ён у 1944 г. быў перакінуты ў Францыю. Адтуль у 1951 г. эмігрыраваў у Канаду, заявіўшы, што не мае дачынення да нацыстаў. У 1999 г. мясцовыя ўлады, даведаўшыся пра яго мінулае, пазбавілі былога калабарацыяніста канадскага грамадзянства. Аднак у 2010 г. федэральны апеляцыйны суд афіцыйна вярнуў яму грамадзянства. Сёння праваабаронцы з цэнтра Візенталя заклікаюць экстрадыраваць яго ў Еўропу, каб ён паўстаў перад судом... Раны вайны не загойваюцца...

Святлана МАРОЗАВА,
доктар гістарычных навук,
прафесар ГрДУ імя Я. Купалы.

Пры падрыхтоўцы артыкула былі выкарыстаны матэрыялы, прадастаўленыя палкоўнікам у адстаўцы Я. М. Далідовічам, за што аўтар выказвае яму вялікую падзяку.

Крымінальныя справы Лакусты і Васюры.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ РАЗМЕЩЕНИЯ ОБЪЕКТОВ РОЗНИЧНОЙ ТОРГОВЛИ В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

Номер лота по порядку	Местоположение земельного участка	Начальная цена (руб.)	Размер задатка (руб.)	Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения	Условие проведения аукциона	Характеристика земельного участка	Кадастровый номер	Инженерная и транспортная инфраструктура
1.	Бобруйский район аг. Горбацевичи	163 123	16 312	7 761 560	Наличие не менее двух участников	Площадь 0,0120 га	№ 720882004101000254	Имеется: подключение к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению, асфальтированный подъезд

ПРИМЕЧАНИЕ: Аукцион состоится **22.04.2013** года в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. М.Горького, д.41, кб.2, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Последний день приема заявлений –**16.04.2013** года до 17.00. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Бобруйске 52-70-24.

1. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка на расчетный счет финансового отдела Бобруйского райисполкома р/с 3604000000929 в филиале 703 АСБ «Беларусбанк», код 760, УНП 700003308, назначение платежа 04002.

Кроме того, представляются:

гражданином - копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем - копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя - нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь - доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица - легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

2. Срок аренды земельных участков – 25 лет.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3.При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4.Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Заместитель председателя
Бобруйского райисполкома И.Н. Кисель

ВА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ДАРОЖНАГА РУХУ ШТОСЬЦІ З... САМААЦЭНКАЙ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Транспартны сродак не пакіне стаянку, пакуль штраф не будзе выплачаны. Адначасова з гэтай адміністрацыйнай мерай ніхто не адмяняе і пазбаўленне кіроўцы вадзіцельскіх правоў на тры гады. Дзяржаўтаінспекцыя цалкам гатова да такіх новаўвядзенняў. Падобная практыка адпрацавана ў многіх кранах свету, так што нам застаецца толькі пераймаць вопыт.

Вышэйадзначаная тэма досыць актыўна абмяркоўваецца ў СМІ. З другога боку, што пакуль гаварыць, калі закон яшчэ не прыняты? І вашы званкі, шаноўныя чытачы, паказалі, што вас пакуль хвалююць сітуацыі іншага кшталту. Шэраг вашых пытанняў указаў на адзін цікавы, важны момант. Нам усім з вамі трэба быць больш адказнымі, свядомымі, дысцыплінаванымі і сумленнымі, у рэшце рэшт адзначаў начальнік упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Юрый ЛІТВІН, якога мы запрасілі ў рэдакцыю, каб прадаставіць магчымасць усім, хто дазвоніцца, вырашыць свае набалелыя пытанні. «Прамая лінія» адназначна паказала: калі б усе разам і кожны паасобку былі менавіта больш... адказнымі, свядомымі, дысцыплінаванымі, сумленнымі, то многія пытанні адпалі б самі сабой.

— Мінск, Вольга. Як вы лічыце, ці ёсць і віна ДАІ ў тым, што каля адной з мінскіх школ не так даўно загінула дзіця? Як атрымліваецца, што спачатку ў нас не знаходзяцца грошы на той жа шлагбаум, а як нешта здарыцца, то знаходзяцца? Ці правільна ўсё ж такі былі расстаўлены знакі на тэрыторыі той школы?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Гэта пытанне ў першую чаргу — да мясцовых органаў улады. Аб'язныя, пад'язныя шляхі — гэта ўсё ў іх кампетэнцыі... Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху» ўскладае адпаведныя абавязкі менавіта на мясцовую ўладу. Таму пытанне лепш адрасаваць камітэту па адукацыі Фрунзенскага райвыканкама або Мінгарвыканкама... Як вядома, крымінальная справа зараз разглядаецца ў судзе, знаходзіцца на стадыі абскарджання, таму маё асабістае меркаванне пакуль павінна застацца са мной.

Знакі каля вышэйзгаданай навучальнай установы размешчаны абсалютна правільна, і ніякіх праблем у гэтым сэнсе быць не магло. Справа ў іншым... Нашы грамадзяне, і тыя ж бацькі, не жадаюць усведамляць самыя простыя рэчы. Можна, вядома, патрабаваць нечага ад некага, прыдзірацца да знакаў, адсутнасці шлагбаума і г.д... Але найперш варта ўсё ж такі больш патрабавальна ставіцца да сябе. Кожнаму вадзіцелю трэба быць больш адказным, пільным... Толькі з-за адсутнасці гэтай элементарнай пільнасці ў пэўным месцы пры пэўных абставінах і ўзнікла падобная крытычная сітуацыя.

Бацькам-вадзіцелям трэба быць наогул абсалютна ўважлівымі. Заўсёды і паўсюль. Разам з тым, кожны чалавек, любы вадзіцель, незалежна нават ад таго, ці ёсць пры ім дзеці, павінен быць надзвычай абачлівым у так званых месцах прыцягнення людзей — на грамадскім транспарце, на стадыёне, у магазіне, тэатры, каля школы і г.д. Паўсюль павінен спрацоўваць элементарны інстынкт самазахавання. Вадзіцелі павінны быць пільнымі не толькі да ўласнага аўто, але і да іншых вадзіцеляў, пешаходаў. Трэба памятаць і аб тым, што ва ўсіх нас розны адукацыйны ўзровень, розны ўзровень стаўлення да бяспекі. І каб не трапіць у непрыемную сітуацыю, трэба вельмі высокія патрабаванні прад'яўляць у першую чаргу да сябе.

— Якім наогул можа быць «алгарытм дзеянняў» бацькоў, якія пажадаюць паўдзельнічаць у будаўніцтве, скажам, паркоўкі каля школы? Куды ім трэба звяртацца?

— Як я ужо сказаў, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху» абавязвае мясцовыя органы ўлады клапаціцца ў тым ліку пра месцы для паркоўкі аўтамабіляў. Значыць, трэба звяртацца ў адміністрацыю таго раёна, дзе размешчана школа. Калі з такой прапановай нехта будзе звяртацца ў Дзяржаўтаінспекцыю, мы ўсё роўна будзем вымушаны перадаць зварот мясцовым органам улады. Каб не губляць час, лепш вырашаць такія пытанні з дапамогай адпаведнай пісьмовай заявы.

— У сталічную СШ № 4, што па вуліцы Камуністычнай, з'язджаюцца дзеці з самых розных раёнаў. Аднак гэта тое месца, дзе, у прынцыпе, раніцай заняты ўсе навакольныя паркоўкі. Бацькі, якія падвозяць дзяцей на асабістым аўтатранспарце, вымушаны заязджаць на зялёную зону. Што, як вы лічыце, тут можна зрабіць?

— Калі вас хвалюе, чаму мы не штрафуем тых, хто заязджае на зялёную зону, то магу сказаць наступнае: для таго, каб штрафаваць усіх, хто ў нашым горадзе заязджае на зялёную зону, неабходна каля кожнай такой зоны выставіць пост ДАІ. Нерэальна нават каля кожнага месца прыцягнення людзей паставіць супрацоўніка ДАІ. Зноў жа, можна звяртацца толькі да свядомасці тых грамадзян, якія пад'язджаюць да школы. Яны павінны быць сапраўднымі і бацькамі, і вадзіцелямі. Калі яны сваімі дзеяннямі не проста няправільна паркуюцца, але ствараюць пры гэтым аварыйныя сітуацыі, то мы ўмяшаемся.

❍ ❍ ❍

— Мінск, Кацярына Яўгенаўна. Гімназія-каледж мастацтваў размяшчаецца побач з адным з мінскіх хлебазаводаў. Прыкладна ў той час, калі бацькі падвозяць сваіх дзяцей на заняткі да вучэбнай установы, па той жа дарозе едуць і машыны хлебазавода. Дарога ж вельмі вузкая. Рух, можна сказаць, аварыйны... Ці можа быць тут нейкае выйсце?

— Што я магу прапанаваць у такой сітуацыі? Закрыць хлебазавод? Або гімназію? Самае простае, што можна прапанаваць, — скарыстацца грамадскім транспартам. Бо калі чалавек няўпэўнена адчувае сябе за рулём, то, мабыць, і не варта садзіцца за руль. Нельга праграмаваць сябе на нейкую аварыйную сітуацыю, дарожна-транспартнае здарэнне. Аўтамабіль — сродак павышанай небяспекі. І тут трэба сувымяраць свае магчымасці ў дачыненні да таго, наколькі небяспечным будзе ваша ваджэнне для вас і навакольных. Калі ёсць сумненні — калі ласка, у нас добра развіты грамадскі транспарт.

❍ ❍ ❍

— Віцебская вобласць, Андрэй. Дапусцім, вадзіцель даўно не ездзіў. Можа быць, проста на працягу зімы, а можа быць, і на працягу, скажам, года. І вось ён выехаў і трапіў у аварыю. Ці будзе мець значэнне той момант, што вадзіцель у пэўнай ступені страціў навыкі ваджэння? Што вы параіце такім вадзіцелям?

— Калі ласка, у нас ёсць і прыватныя аўташколы, і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія з задавальненнем дадуць некалькі ўрокаў па аднаўленні навыкаў, страчаных за зіму або за некалькі гадоў. У рэшце рэшт, можна патрэніравацца хоць бы проста на якой-небудзь закрытай тэрыторыі. Закон, вядома, не абавязвае гэта рабіць. Аднак зноў жа — аб чым ідзе размова? Аб нашай уласнай бяспецы, адказнасці і свядомасці. Наогул навыкі ваджэння аднаўляюцца ў розных людзей па-рознаму. Увогуле можна сказаць, што, хутчэй, яны аднаўляюцца ў больш маладым узросце. Людзі сталага веку могуць патраціць больш часу.

Наогул жа калі чалавек страціў навыкі і трапіў у аварыю, мы расследуем сітуацыю толькі з пункту гледжання парушэння правілаў дарожнага руху. Стаж не ўлічваецца. Для статыстыкі гэта іграе пэўную ролю, мы збіраем такія звесткі, аднак на самім вадзіцелю гэта ніяк не адбіваецца.

❍ ❍ ❍

— Калінкавічы, Вераніка. Неяк мы з сяброўкай ішлі на мясцовую дыскатэку. Да нас пад'ехала машына ДАІ, і супрацоўнікі ветліва пацікавіліся адсутнасцю ў нас флікераў. Нам пагражаў штраф, аднак работнікі ДАІ усё ж такі абмежаваліся прафілактычнай размовай. На адваротным шляху дадому я пачала звяртаць увагу на наяўнасць у іншай моладзі флікераў. І заўважыла, што мы з сяброўкай далёка не адны, у каго іх няма. Якім жа чынам тут праводзіцца работа? Штрафы накладаюцца выбарачна, у межах пэўных акцый або ўсё ж такі кожны парушальнік павінен прыцягвацца да адміністрацыйнай адказнасці?

— Адразу хачу заўважыць, што ў нас у апошнія гады даволі вялікая колькасць дарослага насельніцтва карыстаецца флікерамі. І пешаходы, і веласіпедысты ў сельскай мясцовасці клапоцяцца пра гэта. Паверце, я вельмі і вельмі шкадую, што вы з сяброўкай у цёмны час сутак ходзіце без флікераў. Асабліва ў сельскай мясцовасці. Проста я ведаю рэальную пагрозу і рэальную сітуацыю, звязаную з адсутнасцю флікераў у пешаходаў. Наогул абавязковае нашэнне флікераў у цёмны час сутак прапісана ў нашым заканадаўстве. Так што калі супрацоўнікі ДАІ прад'явілі вам пэўныя прэтэнзіі, то яны цалкам абгрунтаваныя. Закон таксама прадастаўляе супрацоўнікам ДАІ права штрафаваць або не. Супрацоўнік ДАІ можа абмежавацца і папярэджваннем, а можа і выпісаць штраф — у залежнасці ад таго, наколькі грубым было парушэнне... У асобным артыкуле прадугледжаны ўсе абставіны, якія змякчаюць ці абцяжарваюць падобныя сітуацыі.

Мы ўзялі на ўзбраенне вельмі добры сусветны вопыт. З 2007 года мы знізілі аварыйнасць па віне і пры ўдзеле пешаходаў дзесьці на 35 працэнтаў. У рэшце рэшт, спытайце ў саміх вадзіцеляў, якія знаходзяцца за рулём, ці дапамагае ім наяўнасць флікера ў пешахода або веласіпедыста? Пешаход проста не можа ўявіць, як цяжка вадзіцелю рухацца ў цёмны час сутак, у тумане. Калі пешаход рухаецца ў сельскай мясцовасці па ўзбочыне дарогі, ён дзеля самога сябе павінен абазначыць сябе флікерам. Або няхай гэта будзе адзенне са святлоадбівальнай палоскай. Або хоць бы ліхтарык...

Нават у горадзе, дзе дастатковага штучнага асвятлення, неабходна ўлічваць сваю ўласную бяспеку. Мяне добра відаць на гэтай вуліцы? Гэта будзе вырашальным момантам. Мне здаецца, няма ніякай праблемы ў тым, каб выкарыстоўваць калі не флікер, то хоць бы адзенне са святлоадбівальнымі элементамі. Канцэрн «Беллегпрам» выпускае зараз і адзенне, і абутак з такімі элементамі. І за гэта ім — асобная падзяка. Каля пяці-шасці гадоў таму мы выступілі з такой ініцыятывай, і яна была паспяхова падтрымана прадпрыемствамі канцэрна.

❍ ❍ ❍

— Глыбоцкі раён, Георгій Андрэевіч. Вось мы амаль не карыстаемся матацыкламі зімой — некалькі месяцаў, а тэхагляд трэба праходзіць штогод. Можа, хоць бы раз у два гады было б дастаткова?

— Справа ў тым, што значная колькасць матацыклістаў працягвае ездзіць у любы сезон, некаторыя ўхітраюцца не прапусціць нават умовы снегападу. Што да тэхагляду, то Дзяржаўтаінспекцыя з 2005 года не займаецца дзяржаўным тэхнічным аглядам. Гэтае пытанне трэба адрасаваць непасрэдна Міністэрству транспарту і камунікацый. Можаце напісаць ліст у гэтае міністэрства.

— Ганцавічы, Дыяна. Мой брат вадзіцель, аднак дакладна не ведае, ці можна пачынаць рух, калі пешаход прайшоў толькі частку дарогі?

— Такі момант не абазначаны правіламі дарожнага руху. Такім чынам, вы можаце арыентавацца на той момант, які вы палічыце бяспечным у першую чаргу для пешахода.

❍ ❍ ❍

— Мінск, Анатоль Мікалаевіч. Зараз вадзіцелі досыць актыўна пачалі карыстацца відэарэгістратарамі. Самыя розныя парушэнні свабодна выкладваюцца на сайце ГУУС «Перахват». На падставе гэтых доказаў ДАІ высылае вадзіцелям ці пешаходам паведамленні аб накладанні штрафу. А наколькі гэта законна?

— Так, адна з опцый сайта ГУУС — прыём такой інфармацыі. Але шмат заяў паступае і адразу ў ДАІ... Любы доказ з'яўляецца законным. Адміністрацыйны кодэкс не забараняе ўлік такіх даных. У кодэксе, вядома, няма слова «відэарэгістратар», аднак там сказана, што любыя доказы бяруцца да ўвагі, аналізуюцца, і мы з задавальненнем карыстаемся такімі відэазапісамі. Калі перад намі канкрэтны фактычны матэрыял, то вынесці рашэнне значна прасцей, чым па паказаннях тых жа вадзіцеляў. Тым больш, некаторыя вадзіцелі любяць сабе ўнушыць, што праўда на іх баку, а пасля даказваць гэта на ўсіх узроўнях і ва ўсіх інстанцыях... А тут — паказанні без эмоцый, яны ўспрымаюцца куды лягчэй.

— У Расіі зараз вядуцца размовы аб тым, каб забараніць выкарыстанне відэарэгістратараў. У тым ліку і з-за таго, што на лабавым шкле не павінна быць ніякіх старонніх прадметаў. Што ў гэтым сэнсе плануецца ў нас?

— Не магу сказаць, што там у Расіі ў гэтым сэнсе... Калі ласка, калі некаму не падабаецца — можаце не карыстацца. А ўвогуле я б выступаў за тое, каб усе аўтасродкі былі аснашчаны падобнай сістэмай. Відэарэгістратар адназначна дысцыплінуе як самога вадзіцеля, які карыстаецца такім прыстасаваннем у сваім аўтамабілі, так і іншых удзельнікаў дарожнага руху. Я магу сказаць больш: шэраг падраздзяленняў Дзяржаўтаінспекцыі фактычна на 100 працэнтаў абсталяваны відэарэгістратарамі.

❍ ❍ ❍

— Мінск, Сяргей Генадзьевіч. Падкажыце, калі ласка, дзе ў горадзе зараз будуюцца паркінгі? У якіх раёнах, на якіх вуліцах? Якія работы праводзяцца перад тым, як пачаць узвядзенне наземных аб'ектаў? Ці ёсць цяжкасці з тым, каб больш будаваць падземных?

— Будаўніцтвам парковак для вадзіцеляў займаюцца мясцовыя распарадчыя органы ўлады. Я дакладна ведаю толькі тое, што сёння актыўнае будаўніцтва і стаянак, і паркінгаў вядзецца ва ўсіх раёнах горада. Да 2014 года горад абяцае прадаставіць да некалькіх соцень тысяч месцаў. Я думаю, падрабязны адказ можна атрымаць на сайце адміністрацыі вашага раёна ці на гарадскім сайце.

Святлана БАРЫСЕНКА.

(Заканчэнне будзе.)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

21 САКАВІКА 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15716)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Вольга САЦЮК:

«Я БЫЛА ДЗІЦЕМ, КАЛІ ПАЧАЛОСЯ ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ...»

Першы раз Вольга выйшла на сцэну ў 4 гады. Сказаць, што ў свае амаль 20 яна паспела шмат — нічога не сказаць, бо за плячыма конкурс прыгажосці ў 8 гадоў, дзіцячае «Еўрабачанне», дзе яна была першапраходцам, вопыт працы ў гуртах «Верасняты» і «Краскі», а таксама на тэлебачанні ў якасці вядучай. Сёння Вольга Сацюк не збаўляе абаротаў. Яна вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, працуе з маладымі талентамі, радуе прыхільнікаў новымі песнямі, а ў перапынках малюе карціны, чаруе на кухні над чарговым творам мастацтва. Як той казаў, таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім.

— Заўважыла, што ў вашым рэпертуары з'явілася кампазіцыя на ўкраінскай мове, што прыемна здзівіла. Як з'явілася жаданне загучаць у такім ключы?

— Пачнем з таго, што я выраслa ў сям'і, дзе любяць і шануюць фальклор, і маёй першай песняй была беларуская народная. Амаль адразу ж у рэпертуары з'явіліся польскія і ўкраінскія песні. Увогуле, у маім жыцці шмат падзей звязана з Украінай: упершыню я апынулася там на конкурсе «Міні-міс свету—2002», дзе паспрабавала сябе ў якасці юнай мадэлі. Мне вельмі спадабалася, як людзі ў гэтай краіне ставяцца да сваёй мовы і культуры. Моладзь паўсюдна размаўляе па-ўкраінску, спявае песні... Магчыма, нейкае тлумачэнне можна шукаць і ў тым, што я нарадзілася ў Кобрыне, дзе адчуваеш у дыялекце перапляценні моў. Мой дзядуля вельмі любіў украінскія песні. Я расла ў асяродку, у якім дзеці маглі слухаць іх і спяваць. І мне самой падабаецца гучанне на гэтай мове, і публіка падтрымала эксперымент.

— Хацелі б і далей папрацаваць у гэтым напрамку?

— Безумоўна. Калі будзе магчымасць сустрэцца з украінскімі кампазітарамі ці паэтамі, то з задавальненнем хацела б набыць іх творы ў свой рэпертуар. Гэта задавальненне для душы.

— Вы пачыналі з народнага вакалу. Але ж у шоу-бізнэсе іншыя патрабаванні да матэрыялу. Ужо знайшлі свой стыль?

— Патрабаванні ў шоу-бізнэсе ёсць, але ніхто не ведае, якія яны. Напэўна, трэба слухаць сваё сэрца, свой музыкальны густ і парады прафесійных музыкаў. Я пачынала з народнага вакалу і працягваю выконваць народныя песні. У маім рэпертуары можна сустрэць блюз, джаз, рок. Я спрабую сябе ў розных стылях, і ў мяне атрымліваецца, пра што сведчаць водгукі і конкурсныя перамогі. Патрабаванні фарміруюць людзі, якія слухаюць твае песні. Немагчыма падабацца ўсім, але калі робіш нешта прыгожа і прафесійна, то слухач абавязкова знойдзецца.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Новы стыль

У «ванількі» я пайду. Няхай мяне навучаць!

НАВОШТА ЗВЫЧАЙНЫЯ ДЗЯЎЧАТЫ І ХЛОПЦЫ РОБЯЦЬ ГЭТА?

Новаму часу — новыя куміры. Неяк непрыкметна цёмнавалосыя юнакі і дзяўчаты з пірсінгам і ў чорным адзенні, якія называлі сябе готамі, зніклі з вуліц. Многія з тых, ад чыйго выгляду бабулькі ля пад'ездаў не ленаваліся лішні раз перахрысціцца, цяпер сталі сур'ёзнымі дарослымі людзьмі. Перажылі мы і далікатных эма, такіх безабаронна-кранальных і слязлівых, з дзіўнымі, нібыта «пашчыпанымі» валасамі, часта пафарбаванымі ў ружовы колер. Цяпер у падлеткаў іншае захапленне — «ванільны» стыль жыцця...

...Назіраючы, як знаёмыя і незнаёмыя дзяўчаты-падлеткі завязваюць валасы ў высокі, нібыта неахайна зроблены пучок, надзяваюць акуляры ў «цяжкіх» аправах, а таксама, незалежна ад росту і даўжыні ног, носяць супервузкія штаны і угі (мяккія боцікі на плоскай падэшве), я неяк адразу і не здагадалася, што гэта новая субкультура. Спісваючы татальнае засілле ўсіх вышэйпералічаных рэчаў у гардэробе маладых беларускіх дзяўчат на бездакорную працу кітайскай прамысловасці (ну з кім не бывала: купілі з сяброўкай аднолькавыя рэчы!), з часам нават перастала заўважаць неверагодную канцэнтрацыю ўсіх гэтых «пучкоў» і «акуляраў». Пакуль не пачула пра «ванілек». Аказваецца, некаторыя сённяшнія дзяўчынкі так сябе называюць. «Пароль», які вызначае прыналежнасць да «ванільнага» свету — якраз пэўны стыль адзення, цыгарэты з ванільным смакам, густы ў музыцы, якія характарызуюцца схільнасцю да рамантычнасці, вялікі прафесійны фотаапарат ці круты тэлефон, на які «ванілька» часта фатаграфуе свой адбітак у люстэрку... Нават гарады прыхільнікам гэтага руху павінны падабацца не абы-якія, а выключна Нью-Ёрк, Лондан, ну і Парыж яшчэ падыходзіць.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Адказнасць анлайн

У ВІРТУАЛЬНЫМ СВЕЦЕ ЖЫВУЦЬ РЭАЛЬНЫЯ ЛЮДЗІ,

...таму рызыка, што існуе ў рэальным жыцці, прысутнічае і ў глабальнай інфармацыйнай прасторы

(Заканчэнне. Пачатак у «Чырвонцы» за 6 сакавіка.)

— Маргарыта Уладзіміраўна, многія бацькі свядома спрабуюць адсунуць у часе знаёмства свайго дзіцяці з «сусветным павуцінне-м», паколькі асцерагаюцца, што прадметам яго цікаўнасці могуць стаць сайты, якія нанясуць дзіцяці псіхалагічную шкоду, напрыклад, сайты эратычнага ці парнаграфічнага зместу...

— Я скажу так: калі аднаму дзіцяці і ў 6—7 гадоў не рана карыстацца інтэрнэтам, то другому і ў 10-12 гадоў яшчэ не надышоў час. Усё вельмі індывідуальна. Але факт застаецца фактам: дзеці пачынаюць карыстацца інтэрнэтам ва ўсё больш раннім узросце. І калі раней нашай мэтавай аўдыторыяй былі падлеткі 14—17 гадоў, то цяпер мы плануем працаваць ужо з дзецьмі 9-10-гадовага ўзросту. Паколькі ў гэтым узросце дзеці яшчэ ўсяму вераць, у іх адсутнічаюць навыкі крытычнага мыслення, і менавіта ім, у першую чаргу, і трэба тлумачыць усе рызыкі, якія прысутнічаюць у сеціве, тлумачыць розніцу паміж віртуальным і рэальным светам. А гэта ўжо задача бацькоў.

Кожны раз, калі дзеці малодшага школьнага ўзросту выходзяць у інтэрнэт, важна, каб побач з імі быў дарослы. А забароны на карыстанне інтэрнэтам, установка пароляў на камп'ютары — гэта тупіковы шлях. Па-першае, калі дзіця ў 12 гадоў не карыстаецца інтэрнэтам, яно можа стаць прадметам кпінаў сярод аднагодкаў і нават ізгоем у класе. Да таго ж, калі дзіцяці будзе забаронена дома выходзіць у інтэрнэт, то яно пойдзе да сяброў, суседзяў ці ў інтэрнэт-клуб. Не варта забываць таксама, што інтэрнэт даступны сёння і на мабільным тэлефоне. І калі дзіця пажадае паглядзець той ці іншы сайт, яно знойдзе спосаб зрабіць гэта без нагляду бацькоў.

Таму бацькам трэба не забараняць інтэрнэт, а больш цікавіцца справамі сваіх дзяцей, глядзець, з кім яны ўзаемадзейнічаюць у сеціве, у якія гульні гуляюць. Важна наладзіць адкрытыя ўзаемаадносіны, каб дзеці бачылі, што ў выпадку небяспекі бацькі зразумеюць іх і падтрымаюць. Дзіця павінна быць упэўнена: што б яно ні расказала бацькам, тыя не будуць на яго сварыцца і не забароняць яму карыстацца інтэрнэтам.

«ПАЦАЛУНАК Д'ЯБЛА» І «ВАРОТЫ Ў ПЕКЛА»

— Рызыкну выказаць думку, што і бацькі не заўсёды разумеюць небяспеку для сваіх дзяцей. Ці многія з іх ведаюць пра існаванне ў інтэрнэце лічбавых наркотыкаў?

— Несумненна, распаўсюджванне інтэрнэту павялічвае рызыку таго, што дзеці і падлеткі змогуць атрымаць доступ да матэрыялаў, не адпаведных іх узросту і здольных нанесці ім шкоду. Напрыклад, падлеткі могуць атрымліваць па інтэрнэце інфармацыю і запрашэнні ў клубы самазабойцаў, прапановы ўступіць у дэструктыўныя секты. Гэтыя сайты вельмі небяспечныя для дзяцей, якія знаходзяцца ў дэпрэсіі, прыгнечаным стане. Падлеткам могуць паступаць прапановы здымаць бойкі і выкладаць іх у інтэрнэт з абяцаннямі заплаціць за гэта грошы...

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
21 03 2013 г.

У ВІРТУАЛЬНЫМ СВЕЦЕ ЖЫВУЦЬ РЭАЛЬНЫЯ ЛЮДЗІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Сёння без праблем можна выйсці на сайт з рэкамендацыямі па вырабе наркотыкаў з падручных матэрыялаў. А некалькі гадоў таму з'явілася і такая новая небяспека, як лічбавыя наркотыкі, або аўдыянаркотыкі. Размова ідзе пра гукавыя файлы самых распаўсюджаных фарматаў — mp3 або flv. Назваць іх музыкай нельга — гэта, хутчэй, хаатычны шум, стук і скрыгатанне. У аснове дзеяння такіх спецыяльна скантруяваных аўдыяфайлаў ляжаць бінаўральныя хвалі. Фактычна бінаўральныя хвалі — гэта сігнал, які падаецца ў вушы чалавека з рознай частатой. Розніца паміж частотамі — мінімальная. Слухаць аўдыядопінг трэба толькі ў навушніках. Калі гук падаецца непасрэдна ў вушы праз навушнікі, хвалі спрыяюць сінхранізацыі работы абодвух паўшар'яў мозгу, якая назіраецца ў медытатыўных і гіпнатычных станах свядомасці: у чалавека могуць узнікаць галюцынацыі, затарможаныя рэакцыі, можа парушацца каардынацыя рухаў. Накладваючы бінаўральныя рытмы адзін на адзін, можна прымушаць чалавека атрымліваць пэўныя адчуванні...

«Нядорага, бяспечна, легальна» — пад такімі лозунгамі ў сеціве гуляе рэклама аўдыянаркотыкаў. Дзясяткі сайтаў, якія працуюць па тыпу музычных бібліятэк, прапануюць выбраць наркотык, здольны выклікаць пэўныя эмоцыі, фізічныя адчуванні ці нават такі ж эфект, як ад уздзеяння рэальных наркатычных рэчываў. Для «пачаткоўцаў» прапануюцца спецыяльныя «пробнічкі» — файлы працягласцю 10-15 секундаў, якія можна паслухаць бясплатна. «Добразычлівыя карыстальнікі» пакідаюць на чужых старонках рэкламу аўдыянаркаты з каментарыямі кшталту «Я спрабаваў — гэта проста ўлёт!» Здараецца, што распаўсюджвальнікі ствараюць уласныя дзённікі і аўтаматычна ўключаюць у сябры некалькі тысяч карыстальнікаў, тым самым прыцягваючы іх на свае сайты. Суполкі аматараў такіх «забаў» існуюць амаль ва ўсіх сацыяльных сетках. І хоць распаўсюджвальнікі лічбавага допінгу сцвярджаюць, што іх стымулятары не толькі танныя, але і бяспечныя, аднак нарколагі і фізіёлагі з імі не згодныя. На думку ўрачоў, гэтая з'ява нясе як сацыяльную, так і рэальную фізічную небяспеку.

Па-першае, «самыя даступныя, легальныя і танныя сродкі» ў свядомасці моладзі, і асабліва падлеткаў, зніжаюць планку сацыяльных забарон, падмяняючы «хімію» музыкай. І няма ніякай гарантыі таго, што аўдыянаркаман потым не пяройдзе на сапраўдную наркату. Чаго вартыя толькі назвы аўдыянаркотыкаў: «гераін», «пацалунак д'ябла», «вароты ў пекла»... Ёсць меркаванне, што спажыванне аўдыянаркотыкаў з'яўляецца паказчыкам гатоўнасці чалавека перайсці да эксперыментаў з хімічнымі рэчывамі. Да таго ж і небяспека «лічбавага допінгу» для мозгу не даказана. Дзіцячыя псіхолагі, псіхатэрапеўты лічаць недапушчальным любое ўздзеянне на мозг дзіцяці. Дарэчы, расійскія спецыялісты назіралі эфект ад уздзеяння аўдыянаркотыку на электраэнцэфалаграме і прыйшлі да высновы, што яго можна класіфікаваць як парушэнне нармальнай работы галаўнога мозгу.

Пікантныя фота — гэта крута?

— Адным з самых даходных відаў крымінальнага бізнэсу з'яўляецца дзіцячая парнаграфія. Апошнім часам усё часцей гучаць сцвярджэнні, што дзіцячая парнаграфія ў інтэрнэце набыла небяспечныя маштабы...

— Гэта не перабольшанне — у сетцы існуе больш як 4 млн сайтаў з дзіцячай парнаграфіяй, і іх колькасць пастаянна расце. Штодня ў інтэрнэце з'яўляецца больш як 200 новых дзіцячых парнаграфічных выяў. Такім чынам сцэны сэксуальнага насілля над дзецьмі ў інтэрнэце становяцца даступнымі для мільёнаў патэнцыяльных гледачоў.

Часцей за ўсё падлеткі выпадкова трапляюць у інтэрнэце на парнаграфічныя выявы. Хтосьці атрымлівае гэтыя выявы ад патэнцыяльных злачынцаў, а хтосьці свядома выходзіць на парнасайты. Але незалежна ад спосабу атрымання дзіцем парнаграфічных матэрыялаў, яму наносіцца шкода. У большасці дзяцей і падлеткаў сэксуальныя матэрыялы выклікаюць трывогу і хваляванне, але ў некаторых непаўналетніх можа ўзнікнуць залежнасць ад парнаграфіі. А для пэўнай часткі аўдыторыі прагляд парнаграфіі ў далейшым становіцца стымулам да пераймання і ўдзелу ў вырабе порназдымкаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Найноўшыя тэхналогіі, у тым ліку лічбавыя камеры, робяць вытворчасць парнаграфіі больш простай і таннай. Мініяцюрныя камеры дазваляюць вырабляць фота- і відэавыявы без ведама аб'екту здымак. Пашырэюцца і магчымасці аднаўлення, захоўвання і распаўсюджвання парнаграфічных здымкаў: пераведзеныя «ў лічбу» выявы не старэюць і не губляюць сваю якасць пры капіраванні. Акрамя таго, стала магчымым аб'яднаць дзве выявы ў адну або сказіць іх для атрымання новай выявы. У выніку непарнаграфічныя выявы дзяцей можна пераўтвараць у парнаграфічныя або ствараць выявы віртуальных дзяцей. Дзіцячая парнаграфія можа вырабляцца як па-за сецівам, а затым цыркуляваць у кіберпасторы, так і вырабляцца шляхам здымак сэксуальнага насілля над дзіцем у рэальным часе

Існуе яшчэ адзін спосаб стварэння дзіцячай парнаграфіі: калі дзеці і падлеткі з дапамогай вэб-камер, лічбавых і тэлефонных камер вырабляюць парнаграфічныя выявы самі сябе, сваіх сяброў і аднагодкаў, а затым перадаюць іх у віртуальную зместу, але і сайты, якія прапагандуюць насілле, небяспечныя паводзіны і гэтак далей.

— Маргарыта Уладзіміраўна, дапусцім, дзіця ўжо стала мішэнню для зламыснікаў у кіберпасторы. Як пра гэта даведацца бацькам?

— Большасць дзяцей, якія трапляюць пад уплыў інтэрнэт-злачынцаў, шмат часу праводзяць у чатах і сацыяльных сетках. Таму, на маю думку, у жыцці дзіцяці абавязкова павінна быць штосьці такое, што цікавіла б яго за межамі інтэрнэту, каб яно не зацыклівалася на віртуальным свеце. Раней дзеці, якія не знаходзілі дома цеплыню і паразуменне з боку сваіх блізкіх, ішлі ў дваровыя кампаніі, а цяпер яны сыходзяць у віртуальны свет. Таму вельмі шмат залежыць непасрэдна ад саміх бацькоў, ад таго, наколькі яны цікавяцца жыццём сваіх дзяцей. Бацькоў павінна насцярожыць, калі дзеці, седзячы за камп'ютарам, зачыняюць дзверы ў свой пакой, хутка выключаюць манітор ці пераключаюцца на іншае «акно», калі ў пакой уваходзіць дарослы.

Хвалявацца трэба і тады, калі дзіцяці тэлефануюць людзі, якіх бацькі не ведаюць, асабліва дарослыя. Калі дзіця стала замкнёным, калі яно нервуецца ад тэлефонных званкоў або SMS-паведамленняў, адключае свой мабільны тэлефон. Папрасіце дзіця расказваць вам пра любыя непрыемныя сітуацыі, звязаныя з кантактамі ў інтэрнэце, або пра пагрозы, якія могуць паступаць на яго мабільны тэлефон. Пераканайце яго ў тым, што не будзеце злавацца, пра што б яно вам ні сказала...

Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.

Сям'я і віртуальны свет: хто пераможа?

— А што ў сілах бацькоў зрабіць, каб абараніць сваіх дзяцей ад патоку негатыўнай інфармацыі ў інтэрнэце?

— Бацькі могуць устанавіць на камп'ютар спецыялізаваныя абарончыя праграмы, якія ў хатніх умовах часткова выконваюць задачы фільтрацыі. Такія праграмы здольныя заблакіраваць доступ да непажаданай спасылкі, калі дзіця на яе націсне. Да таго ж сёння любы інтэрнэт-правайдар па заяве карыстальніка можа заблакіраваць доступ да сайтаў з негатыўнай інфармацыяй па заяве бацькоў. Гэта могуць быць сайты не толькі парнаграфічнага

Дзясяткі сайтаў, якія працуюць па тыпу музычных бібліятэк, прапануюць выбраць наркотык, здольны выклікаць пэўныя эмоцыі, фізічныя адчуванні ці нават такі ж эфект, як ад уздзеяння рэальных наркатычных рэчываў.

ПАРАДЫ БАЦЬКАМ:

1 **Складзіце правілы бяспечных паводзін у інтэрнэце, а таксама алгарытм паводзін дзіцяці пры сутыкненні з небяспечным незнаёмцам або сэксуальным дамаганнем. Напішыце іх на паперы і замацуйце побач з камп'ютарам.**

2 Распытайце дзіця пра яго «віртуальных сяброў», пацікаўцеся, для чаго ён выкарыстоўвае інтэрнэт.

3 **Патлумачце дзіцяці, што нельга высылаць віртуальным знаёмым свае фотаздымкі і асабістую інфармацыю.**

4 Устанавіце камп'ютар у месцы, даступным для ўсіх членаў сям'і. Гэта значна спросціць кантроль за яго выкарыстаннем.

5 **Праглядайце інфармацыю, якая ўтрымліваецца ў камп'ютары дзіцяці. Але не рабіце гэта без прысутнасці сына або дачкі, бо так вы рызыкуеце страціць іх давер, а, значыць, і магчымасць аказаць дапамогу, калі тая ім сапраўды спатрэбіцца.**

6 Устанаўлівайце праграмы, якія спыняюць доступ да сайтаў эратычнага і парнаграфічнага зместу.

7 **Будзьце сябрам свайму дзіцяці, цікаўцеся яго захапленнямі і абмяркоўвайце ўсе праблемы, якія ўзнікаюць.**

8 Патлумачце дзіцяці, што ўсе правілы бяспечных паводзін у інтэрнэце застаюцца ў сіле і тады, калі яно карыстаецца інтэрнэтам за межамі дома, напрыклад, у інтэрнэт-кавярні, у школьным камп'ютарным класе ці ў сяброў.

Ідэі маладых

УСЁ — У СПРАВУ І НА КАРЫСЦЬ!

Збор арыгінальных моладзевых ідэй у рамках праекта БРСМ «100 ідэй для Беларусі» працягваецца.

Крысціна Пічугіна, якая вучыцца ў гімназіі №1 Жодзіна, вырашыла заявіць пра сябе адразу двума праектамі. Адзін з іх прысвечаны такой перспектыўнай біяэнергетычнай культуры, як тапінамбур. Вывучэннем расліны дзяўчына займалася на працягу двух гадоў.

Тапінамбур (земляная груша) — эканамічна выгадная расліна. Патрабуе мінімум вільгаці і сонечнага святла, а паўторная пасадка не патрабуецца на працягу 8-10 гадоў. Гэтая культура мае шматлікія кірункі практычнага выкарыстання. Па-першае, тапінамбур можа быць карысны і як зялёны корм у перыяд ранняга цвіцення, і ў выглядзе сіласу, ды і клубням знойдзецца прымяненне. Падчас лабараторных даследаванняў было ўстаноўлена, што гэтая нетрадыцыйная сыравіна валодае пэўнымі перавагамі ў параўнанні з іншымі кармавымі культурамі. Напрыклад, адзін кілаграм зялёнай масы і клубняў тапінамбуру змяшчае 4-6 МДж абменнай энергіі.

Летась гімназістка прадстаўляла сваю працу на міжнароднай выставе даследчыцкіх праектаў у Стамбуле, дзе атрымала галоўны прыз у намінацыі «За цікавую ідэю і практычную значнасць працы».

Па-другое, расліна можа выкарыстоўвацца ў якасці альтэрнатыўнага віду паліва. Так, з яе зялёнай масы можна вырабляць брыкет і здабываць біягаз. Колькасць энергіі, якая выдзяляецца брыкетам з лісця і сцяблін расліны, — 15,3-16,6 МДж на 1 кг. Пробныя брыкецікі, зробленыя сваімі рукамі, Крысціна прэзентавала ўжо не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Так, летась гімназістка прадстаўляла сваю працу на міжнароднай выставе даследчыцкіх праектаў у Стамбуле, дзе атрымала галоўны прыз у намінацыі «За цікавую ідэю і практычную значнасць працы».

— Праект выклікаў цікавасць на конкурсе. Зараз жа вельмі актуальная тэма пошуку альтэрнатыўных крыніц энергіі, таму на нас звярнулі ўвагу, — дзеліцца Крысціна. — Хочацца спадзявацца, што і ў Беларусі знойдуцца ахвотныя, каб заняцца прамысловым вырошчваннем гэтай культуры, бо яе перавагі — відавочныя.

Ідэя другога праекта жодзінскай гімназісткі, які таксама мае практычны патэнцыял, нарадзілася пасля экскурсіі на Слонімскі кардонна-папяровы завод «Альберцін» і прадпрыемства Smurfit Kappa ў Галандыі. Там дзяўчына даведалася, што існуе тэхналогія па раздзяленні абгорткі «тэтра-пак». Так і з'явіўся праект «Другое жыццё абгорткі Tetra Pak»

У Беларусі сёння «тэтра-пак» не перапрацоўваецца, а пасля выкарыстання проста пераўтвараецца ў смецце. А між тым абгортка, якая на 75% складаецца з высакаякаснага кардону, на 20% з поліэтылену і на 5% з алюмінію, можа падлягаць паўторнай перапрацоўцы. Юная даследчыца, прапануючы выкарыстоўваць «тэтра-пак» з карысцю, нават распрацавала мадэль кантэйнера для яе збору. Пасля раздзялення абгорткі на поліэтылен, цэлюлозу і алюміній кожнаму з гэтых матэрыялаў, сцвярджае дзяўчынка, знойдзецца сваё прымяненне. Цэлюлоза зноў пойдзе на вытворчасць кардону. Поліэтылен і алюміній — для прэсаваных панэляў будаўнічых матэрыялаў. Таксама спалучэнне палімераў з алюмініем можна выкарыстоўваць і для выпрацоўкі энергіі. Як бачым, нічога лішняга не застаецца...

Алена ДРАПКО.

Асновы эканомікі


Працоўныя пытанні абмяркоўваюць Андрэй Шарэўскі, Дар'я Ільясевіч і Марына Рыпалава.

ЗАРАБЛЯЦЬ ГРОШЫ ВУЧЫЦЬ... ШКОЛА

Дзень, калі падлетак зарабіў першы ў сваім жыцці «рубель», запамінаецца назаўсёды. Аднак кудысьці ўладкавацца 14-гадоваму школьніку даволі складана. Працаваць ён павінен не больш за чатыры з паловай гадзіны, а аплата павінна налічвацца яму ў поўным аб'ёме. Ды нават калі работа і знойдзецца, дзе ж знайсці час на выкананне хатніх заданняў? На Міншчыне вырашылі пайсці іншым шляхам: у звычайных сярэдніх школах пачалі ствараць бізнэс-кампаніі. Старшакласнікі вырабляюць прадукцыю, прадаюць яе і атрымліваюць за гэта грошы — зусім як у дарослым жыцці. Журналіст «Чырвонкі» зазірнуў у бізнэс-кампанію «Крыніца», якая працуе ў сярэдняй школе № 4 горада Дзяржынска.

— Зараз на Дзяржыншчыне працуюць 18 школьных бізнэс-кампаній, дванаццаць з іх атрымалі падтрымку на ўзроўні раёна. Амаль усім у такіх арганізацыях распараджаюцца падлеткі. Дарослыя ж толькі назіраюць за працэсам і ўмешваюцца ў яго выключна тады, калі ў гэтым узнікае патрэба. У нейкай ступені работу бізнэс-кампаніі можна лічыць сучаснай эканамічнай гульнёй, у якой ёсць і бонусы для яе ўдзельнікаў, — мяркуе начальнік аддзела адукацыі Дзяржынскага райвыканкама Вацлаў Матусевіч. — Яны не толькі атрымліваюць грошы за прададзеныя вырабы, але і набываюць першы досвед работы ў сучасных эканамічных умовах.

Праца бізнэс-кампаніі прыносіць плён не толькі дзецям, але і самой навучальнай установе: школа ці гімназія атрымлівае грошы ад пазабюджэтнай дзейнасці. Гэтай думкі прытрымліваецца і дырэктар сярэдняй школы № 4 Дзяржынска Зінаіда Федаровіч:

— Ідэя стварыць бізнэс-кампанію ў школе з'явілася яшчэ пазалетась. Але перш чым заняцца новай справай, мы вывучалі вопыт школ-першапраходцаў. Пасля трэба было знайсці настаўніка-энтузіяста, які б пагадзіўся кіраваць арганізацыяй. Ім стала выкладчыца матэматыкі Наталля Прыкота.

Ніякія глабальныя мэты перад сабой «Крыніца» не ставіць. Перш за ўсё трэба навучыць школьнікаў асновам эканомікі. Трэба, каб юнак або дзяўчына непасрэдна ўбачылі на практыцы, што і як працуе.

Структура бізнэс-кампаніі — простая. На яе чале стаіць штаб з трох адзінаццацікласнікаў, які займаецца перш за ўсё арганізацыйнымі пытаннямі. Пасля мы набралі 9 швей з ліку школьніц і заключылі з імі працоўныя дагаворы. Пры гэтым выконваліся тры ўмовы — узрост не менш за 14 гадоў (згодна з Працоўным кодэксам), пісьмовая згода бацькоў і жаданне дзяўчыны працаваць. Знаходзяцца ў майстэрні яны пераважна па суботах, не больш за чатыры гадзіны.

Першым сур'ёзным выпрабаваннем стаў заказ ад мясцовага Цэнтра развіцця дзіцяці на пашыў пасцельнай бялізны. Са школьнай майстэрні выйшлі 498 камплектаў — падкоўдранікі, прасціны, навалачкі... І ніводны не быў забракаваны.

Кіруе «Крыніцай» вучаніца 9 «Б» Алёна Дубінец. Ёй дапамагае менеджар па вытворчасці Марына Рыпалава. Яна адказвае за ахову працы і якасць прадукцыі. Менеджар па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях Андрэй Шыраўскі — адзіны хлопец у арганізацыі. Ён займаецца ўсім тым, што так ці інакш звязана з выкарыстаннем камп'ютара.

Васьмікласніца Аліна Нупрык шые падкоўдранік.

Па выніках працы складаецца адпаведны акт, і ўжо школьная бухгалтэрыя налічвае маладым работнікам грошы. Форма аплаты — здзельная. Зразумела, што аб мільённых сумах гаворка не ідзе. Але на кішэнныя выдаткі зарабіць можна з ліхвой.

Спецыялізацыя кампаніі вызначалася, зыходзячы з таго, што ў школе ёсць добрая швачная майстэрня. Вядома, яна патрабуе мадэрнізацыі, на што і будзе выдаткавана частка прыбытку.

— Трэба было вывучаць амаль усё з нуля, ісці метадам спроб і памылак, — прыгадвае Наталля Прыкота. — Нават калі распрацоўвалі бізнэс-план, змарнавалі шмат сіл і часу. Спачатку настаўніку давялося вывучаць усю патрэбную інфармацыю, а пасля тлумачыць яе дзецям.

Спецыфіка «Крыніцы» ў тым, што яна працуе толькі па папярэдніх заказах. І першым сур'ёзным выпрабаваннем стаў заказ ад мясцовага Цэнтра развіцця дзіцяці на пашыў пасцельнай бялізны. Са школьнай майстэрні выйшлі 498 камплектаў — падкоўдранікі, прасціны, навалачкі... І ніводны не быў забракаваны. Зараз жа неабходна абнавіць бялізну ў групах падоўжанага дня ў самой школе, чым і зоймуцца работнікі «Крыніцы». Але працу тармозіць тое, што пакуль не да канца адпрацавана нарматыўная база, якая датычыцца менавіта школьных бізнэс-кампаній.

Пасцельную бялізну больш не шые ніводная школьная бізнэс-кампанія ў раёне. Канкурэнты для «Крыніцы» — Дзяржынская швачная фабрыка і Камбінат надомнай працы... Але ж гэта і зусім іншы ўзровень!

Валяр'ян ШКЛЕННІК, фота аўтара.
Мінск — Дзяржынск.

Дарослае жыццё

МАЛАДЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ — УСЕ ЎМОВЫ

І тады размеркаванне будзе «мёдам намазанае»

Для некаторых учарашніх студэнтаў размеркаванне — не самая прыемная працэдура. Пашанцуе, калі размяркуюць у горад. А вось адпрацоўка ў вёсцы для многіх гучыць як прысуд.
Але толькі не для дзяўчат, якіх пасля заканчэння навучальных установ накіравалі ў Мажэйкава — аграгарадок, які знаходзіцца недалёка ад Ліды. «Намазанае» гэтае месца мёдам ці не, але дзяўчаты з задавальненнем тут жывуць і працуюць, нягледзячы нават на тое, што «бясконцыя» два гады ўжо даўно прайшлі.

На новым месцы — як у «сваёй талерцы»

Анастасія Чарняўская працуе майстрам змены брадзільных вытворчасцяў на лікёра-гарэлачным заводзе «Мажэйкава», вядомым і па-за межамі рэгіёна. Сюды дзяўчына трапіла пасля заканчэння Маладзечанскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа, дзе вучылася па спецыяльнасці «тэхнік-тэхнолаг».

Адпрацаваўшы патрэбныя два гады, Насця не палічыла патрэбным шукаць іншае месца працы. Добрыя жыллёвыя ўмовы, годны заробак — навошта шукаць нешта іншае? Тым больш што за чатыры гады жыцця ў Мажэйкаве дзяўчына стала амаль сваёй: наладзіла добрыя кантакты са старэйшымі калегамі, пазнаёмілася з мясцовымі жыхарамі. З'явіліся тут у яе і сябры.

— Асаблівасці жыцця ў сельскай мясцовасці мне былі вельмі добра знаёмыя, — расказвае Насця ЧАРНЯЎСКАЯ. — Я сама нарадзілася ў вёсцы, што ў Астравецкім раёне, дзе жыла разам з бацькамі ажно да паступлення ў каледж. Шчыра кажучы, мая малая радзіма значна меншая па памерах за Мажэйкава. Таму да інфраструктуры з адной харчовай і адной прамтаварнай крамамі, адной аптэкай і адным пунктам сувязі мне не прывыкаць.

Не ўзнікла складанасцяў у дзяўчыны і з жыллёвым пытаннем. Адзіны ў аграгарадку інтэрнат, прызначаны якраз для маладых спецыялістаў, знешне нічым не вылучаўся: звычайная двухпавярховая пабудова. Толькі замест няўтульнага інтэрнацкага памяшкання на некалькі чалавек Насцю чакаў асабісты вялікі пакой з «еўрарамонтам». Пагадзіцеся, нядрэнныя ўмовы для маладога спецыяліста! Асабліва, калі ён прыехаў не адзін, а ў кампаніі з дзвюма аднакурсніцамі, з якімі не адзін год сябруе.

Адна з іх і сёння разам з калегай-сяброўкай працуе на заводзе, толькі ўжо не жыве па-суседстве: свая сям'я. А Насця замуж не спяшаецца, кажа, што ў яе ўсё яшчэ наперадзе.

— Не ў гэтым справа: вясковы ці гарадскі, — прызнаецца яна. — Многія мясцовыя хлопцы мне сталі сябрамі, з якімі мы весела бавім час. Магчыма, яны ў чымсьці нават пераўзыходзяць гарадскіх юнакоў. Толькі я не стаўлю перад сабой мэту знайсці сярод іх жаніха.

Марыя Янцэвіч.

— А бавіць час вясковая моладзь так, як і гарадская: адна забава — інтэрнэт, — упэўнена Насця. — Вядома, мы не заўсёды сядзім у чатырох сценах. Часта сустракаемся, гутарым. Калі захочам павячэраць у кавярні ці пагуляць у більярд — няма ніякай праблемы: селі ў машыну — і праз 30 хвілін мы ў Лідзе. Летам ходзім купацца на рэчку, у лесе смажым шашлыкі... Тады, наадварот, гарадскія сябры едуць да нас у вёску.

Праўда, як і для ўсіх занятых людзей (няважна, дзе яны жывуць) адпачынак для Насці — раскоша. Пасля 12-гадзіннай змены дзяўчыне перш за ўсё хочацца паспаць, а пасля сну трэба прыгатаваць ежу да наступнай змены. Аднак да працоўнага рэжыму «два дні праз два дні» дзяўчына ўжо прызвычаілася. Прычым у больш-менш вольны час яна паспявае яшчэ пісаць кантрольныя і курсавыя работы: атрымлівае вышэйшую адукацыю ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце харчавання.

У вёсцы — і кашалёк паўнейшы?

Там жа завочна вучыцца і яе суседка па інтэрнаце Марыя Янцэвіч. Яна, як і Насця, прыехала ў Мажэйкава на працу на той жа лікёра-гарэлачны завод па размеркаванні таксама пасля заканчэння Маладзечанскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. І таксама, адпрацаваўшы два гады, вырашыла застацца ў вёсцы.

Калі шчыра, па першым часе для Машы незвычайным было хадзіць заўсёды ў адну і тую ж краму і, калі пашанцуе, купляць усё тое, што і ў горадзе, толькі трохі даражэй. Пасля дзяўчына знайшла плюсы і ў гэтым:

— У горадзе, бывае, трэба патраціць амаль палову дня, каб схадзіць у краму і нешта купіць. Памяць дыктуе, што і дзе нешта танней набыць. А тут пайшоў, напрыклад, па каўбасу — ты яе і купіш, бо іншых спакусаў няма. Таму ў вёсцы і кашалёк не так хутка пусцее, як у горадзе.

Насця Чарняўская.

Праўда, апранацца Марыя ездзіць усё ж туды, бо тое, што прадаецца ў мясцовай краме, маладой дзяўчыне купляць не хочацца. А ва ўсім іншым у вёсцы ўмовы не горшыя, чым у горадзе. І самае цікавае, што так лічыць дзяўчына, якая ніколі дагэтуль не жыла ў сельскай мясцовасці! Яна родам з Ліды, да якой ад Мажэйкава рукой падаць. І нягледзячы на тое, што ў Лідзе ёсць кватэра, знайшлася б і праца (ёй былі прапановы ўладкавацца на адным з вядомых прадпрыемстваў у горадзе), дзяўчына вельмі задаволена ўмовамі працы, жылля і, што мае вялікае значэнне, заробкам.

Толькі, як звычайна, ёсць адно «але». У маладога спецыяліста ёсць жаніх, які жыве ў Лідзе. Здавалася б, чым не стымул, каб пераехаць?

— Калі хочацца пабачыцца, ён на машыне «далятае» да мяне за 20 хвілін. Бывае, што, жывучы ў адным горадзе, за такі час адно да аднаго не даедзеш! Ды і я ў выхадныя наведваю сваю малую радзіму. Так што вялікай праблемы я тут не бачу, — кажа Марыя.

...Напэўна, сапраўды, Мажэйкава — адзін з тых аграгарадкоў, дзе для замацавання маладых спецыялістаў створаны ўсе ўмовы. Як прызналіся дзяўчаты, для іх асабліва важна, што кіраўніцтва прадпрыемства, дзе яны працуюць, двойчы на год адпускае іх на сесію, якую яшчэ і аплачвае!

Вераніка КАНЮТА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
21 03 2013 г.

«Я БЫЛА ДЗІЦЕМ, КАЛІ ПАЧАЛОСЯ ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ...»



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Але ж часам складваецца ўражанне, што многія поп-выканаўцы мала чым адрозніваюцца...

— Я не хацела б каментаваць чужую працу. Пра нашых артыстаў не магу нічога сказаць, бо для мяне яны — вялікая сям'я, з якой я выступала не ў адным канцэрце. І мне складана аб'ектыўна ацэньваць некага з пункту гледжання звычайнага слухача. Я проста ведаю, як і чым жывуць гэтыя людзі. Пра сябе магу сказаць, што я яшчэ ў пошуку свайго гучання, але ўсё тое, што спявала і спяваю, намагаюся рабіць максімальна на высокім узроўні. У кожнай песні ёсць свая гісторыя ўзнікнення і сваё прызначэнне. Калі нешта не падабаецца, то ніхто не прымушае слухаць. Музыка — гэта мастацтва, дзе кожны сам выбірае шлях.

— Ведаю, што вы даяце майстар-класы для дзяцей. Якія ўражанні ад сустрэч з юнымі талентамі?

— Працую з дзецьмі ў студыі «Наталі» Наталлі Скопец. І на майстар-класы трапляю. Мяне запрашаюць, бо я — дзіця, якое рана пасталела. Давялося многае паспрабаваць, таму я магу падзяліцца сваім вопытам. Новае пакаленне — гэта проста нешта! Яны ўсё ўбіраюць, як губка. Яны маюць вялікі патэнцыял, які вельмі прыемна і адначасова страшна адкрываць, не ўсе дарослыя маюць тое, што ёсць у гэтых дзяцей. У іх сфарміравана ўласнае бачанне таго, што ім падабаецца, а што не.

— Выкладчык — вельмі важны чалавек у станаўленні маладога таленту...

— Выкладчык вельмі многае вырашае ў жыцці любога дзіцяці. Быць настаўнікам — гэта вялікая адказнасць і праца. Вядома, прафесійным выкладчыкам мяне назваць нельга, бо я сама знаходжуся ў працэсе навучання па гэтай спецыяльнасці, таму, напэўна, у першую чаргу магу даць парады на эмацыянальным і псіхалагічным узроўні, падштурхнуць да розных эксперыментаў. Гэта як вырошчванне кветкі: як паставіш апору, такую форму і будзе мець расліна. З таленту можна ляпіць, але варта ведаць меру, патэнцыял. Важна лічыцца з жаданнямі і пунктам гледжання дзіцяці. Знайсці свайго настаўніка — палова поспеху, нават больш.

— Раскажыце, як вам працуецца побач з сястрой. У спрэчках нараджаецца творчасць?

— Яна таленавітая. Займалася танцамі, потым вучылася на журналіста, а зараз рэалізуе сябе яшчэ і як мадэльер — вельмі паспяхова. І займаецца маімі справамі. У нас цікавае суіснаванне, бо яна перыядычна спрачаецца з маімі музычнымі густамі, а я ў сваю чаргу — з яе стылёвымі. Рознага кшталту непаразуменні і спрэчкі заканчваюцца фразамі: «Ну што? Як ты лічыш, можа гэта?». Без бласлаўлення адна адной справа ў нас не рухаецца.

— Тады са стылем усё зразумела. А як з доглядам сябе?

— Ніякіх дыет ніколі не прытрымлівалася. Але, як любая дзяўчына, заўсёды знайду, да чаго ў сабе прыдрацца. Безумоўна, прафесія патрабуе трымаць сябе ў форме. Калі хочаш добра выглядаць, трэба прыкласці намаганні. А ўвогуле, колькі людзей столькі і думак, не варта кідацца з крайнасці ў крайнасць, бо могуць быць розныя наступствы.

— Вы не толькі спяваеце, але яшчэ і жывапісам займаецеся...

— Я вельмі эмацыйны чалавек, а фарбы дапамагаюць знайсці выхад для эмоцый. Я пішу толькі тады, калі адбываецца нешта важнае ў маім жыцці ці калі ўзнікае цікавая ідэя. Для мяне мае значэнне сам працэс, а не вынік.

— Як вам удаецца сумяшчаць навучанне, канцэрты і свае захапленні?

— Я была дзіцем, калі пачалося дарослае жыццё — жыццё ў рытме конкурсаў і канцэртаў пад сафітамі. Я ўжо прывыкла да гэтага і думаю, што яшчэ так мала зрабіла...

— Поспех — гэта ўзровень, якому трэба адпавядаць. На шляху да яго чалавек фарміруецца, а часам і ламаецца...

— Сапраўды, многія рэчы ламаюць цябе маральна, асабліва тады, калі ты ствараеш нешта, дзелішся гэтым, а крытыка і водгукі не апраўдваюць тваіх спадзяванняў... Гэта раніць. Бывае, што людзі пасля гэтага наогул сыходзяць у іншыя сферы дзейнасці. Немагчыма дасягнуць поспеху, калі ты адзін. Заўсёды ёсць людзі, дзякуючы якім мы рухаемся. Важна, каб былі тыя, з кім можаш раздзяліць радасць і гора, узлёты і падзенні.

— У вашых песнях ярка гучыць тэма кахання. Быць шчырай вам дапамагае ўласны вопыт?

— Так, тое што ў маіх песнях — з асабіста перажытых сітуацый. Каб нешта патлумачыць і расказаць, адным патрэбна слова, другім — погляды і жэсты. У маім выпадку я раблю гэта праз песні. І мне здаецца, што так атрымліваецца больш пранікнёна.

— А ёсць уяўленне пра тое, якой павінна быць другая палавінка?

— Адназначна чалавек павінен быць апорай і падтрымкай, бо не кожны здольны зразумець і прыняць мой стыль жыцця. Спачатку гэта можа выклікаць інтарэс, але рана ці позна вяртанне дадому ў позні час сутак, бясконцыя пераезды згасяць і інтарэс, і адносіны. Зразумела, мужчына павінен быць мужчынам. Для мяне важна адчуваць свабоду і разняволенасць, знаходзячыся побач з ім. Не толькі таму, што жывеш з ім у адной кватэры і ў вас зубныя шчоткі ў адной шклянцы стаяць, а яшчэ і таму, што вас яднаюць «фішкі» і ўспаміны, вядомыя толькі вам.

— Вам уласціва будаваць планы, ці вы жывяце сённяшнім днём?

— Год таму я магла б вас запэўніць, што жыву толькі сённяшнім днём. Але ў кожнага, мабыць, настае час, калі пачынаеш думаць: трэба будаваць глабальна і надоўга, выходзіць на новы ўзровень сваёй творчасці. Няхай на пяць гадоў наперад маё жыццё не запланавана, але за гэты год шмат што хочацца зрабіць.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва Вольгі САЦЮК.

Гэта сур'ёзна

ГУЛЬНЮ — НА СТОЛ!

Якія гульні сёння найбольш папулярныя? Якія навінкі з'явіліся за апошні час? Як і чым жыве беларуская супольнасць аматараў настольных гульняў? Пра гэта можна было даведацца падчас X Рэспубліканскага фестывалю настольных гульняў «Юнікон», які прайшоў нядаўна ў Мінску.

НЕ ДЗЕЛЯ КАРЫСЦІ

Клуб настольных гульняў «Кронверк» — старэйшы і буйнейшы ў Беларусі. Яго кіраўнік Андрэй Акушка нават не бярэцца падлічыць колькасць удзельнікаў, якая пастаянна расце. Сюды прыходзяць самыя розныя людзі, узрост якіх пачынаецца ад дзесяці гадоў. Але ў сярэднім членам клуба 20-22 гады. Аб'ядноўваюць гэтых людзей не толькі настольныя гульні. Клуб жыве, як вялікая дружная сям'я, трапіць у якую можа любы ахвотны. Нават калі вы не ўмееце гуляць, вас навучаць.

Сам Андрэй Анатольевіч мае ў гэтай справе вялікі стаж — займаецца настольнымі гульнямі з 1996 года. Калісьці яму вельмі хацелася, каб у Беларусі з'явіўся такі клуб. І аднойчы зразумеў: сам не зробіш — ніхто не зробіць. У 2002 годзе разам з камандай аднадумцаў Андрэй Акушка звярнуўся ў Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі, і з тых часоў клуб «Кронверк» мае тут свой пакой № 517. І хоць гэты занятак не прыносіць грошай, затое колькі прыносіць задавальнення!

— Першы час было даволі сумна, — прыгадвае Андрэй Акушка. — Мы мелі тады толькі дзве гульні — «Эпоху бітваў» і «Каланізатараў». На выставе вы можаце пабачыць 40-50 розных гульняў, а ў нашым кабінеце іх у два разы больш.

КАЛІ ВОЧЫ РАЗБЯГАЮЦЦА

«З часам у нас з'явілася патрэба ў мерапрыемствах, якія выходзілі б за межы аднаго кабінета. Спачатку такімі мерапрыемствамі сталі семінары для аматараў настольных гульняў. А ў 2003 годзе мы правялі першы фестываль. Тады за два дні яго наведала 150 чалавек». Кіраўнік клуба кажа, што зараз у час «пік» на фестывалі такая колькасць людзей можа гуляць адначасова, а за два дні імпрэзу наведваюць 600-800 чалавек.

...Я прагульваюся паміж паўсотні сталоў, большасць з якіх ужо занятая азартнымі гульцамі. Тут і картачныя гульні, і настольныя. Забаву на свой густ можа знайсці і дзіця, і малады чалавек, і жанчына, і дарослы мужчына. Ёсць тут як зусім простыя гульні, так бы мовіць, для пачаткоўцаў, так і цэлыя стратэгічныя ваенныя ландшафты, раскінутыя на некалькі сталоў, на якіх размяшчаюцца макеты будынкаў і баявой тэхнікі. Наведнікі снуюць паміж сталамі і прыглядаюцца, у што б такое пагуляць. Сярод іх даволі цяжка вызначыць «партрэт аматара настольных гульняў». Кантынгент розны: у асноўным гэта моладзь ад 18 да 30 гадоў, але таксама даволі шмат мужчын старэйшага ўзросту і маладых бацькоў з дзецьмі.

Сярод іх даволі цяжка вызначыць «партрэт аматара настольных гульняў». Кантынгент розны: у асноўным гэта моладзь ад 18 да 30 гадоў, але таксама даволі шмат мужчын старэйшага ўзросту і маладых бацькоў з дзецьмі.

— Гэта адзін з найбуйнейшых фестываляў на постсавецкай прасторы, — распавядае Андрэй Акушка. — У Расіі толькі адзін з маскоўскіх фэстаў можа з намі параўнацца. Ва Украіне, краінах Балтыі, Сярэдняй Азіі нічога падобнага ўвогуле не праводзіцца.

Ужо каторы год запар мерапрыемства праходзіць у рэспубліканскім, а па сутнасці, у міжнародным фармаце: сярод гасцей — ігракі і распрацоўшчыкі з Расіі і Украіны, летась таксама былі літоўцы. Замежнікі (у прыватнасці, расійскае некамерцыйнае партнёрства «Акадэмія гульняў») дапамагаюць арганізоўваць фестываль, дасылаюць гульні ў падарунак, а таксама дэманструюць навінкі, выпушчаныя за апошні год. Тое самае робіць і беларускі бок, калі выязджае на замежныя форумы. Карацей, супрацоўніцтва ў аматараў гульняў зусім не «цацачнае».

Павел Курганаў тлумачыць правілы сваёй гульні.

ЯК Я МАНАХА РАТАВАЛА

Усё, што адбываецца тут, мае адну мэту — аб'яднаць людзей, апантаных гульнямі.

— Раз на год мы даём пляцоўку, каб людзі сабраліся і пагулялі ўсе разам. Калі ў кагосьці дома ёсць гульня, якой няма ў нас, ён можа яе прынесці і прадэманстраваць, — кажа Андрэй Акушка.

«Можа, вы хочаце пагуляць?» — звяртаецца да мяне даволі малады, але сівавалосы мужчына. Прыйсці на фестываль гульняў і не пагуляць — злачынства, і я з гатоўнасцю адказваю: «Хачу, толькі не ўмею. Навучыце?» Той згаджаецца.

Майго новага знаёмага завуць Павел Курганаў. Ён каля сямі гадоў займаецца настольнымі гульнямі. Прыйшоў на фестываль, каб паказаць сваю гульню, якую прывёз з Нямеччыны і якой няма амаль ні ў кога ў Беларусі.

Гульня называецца «Імя ружы» — па матывах аднайменнага рамана Умберта Эка. Кожны з удзельнікаў атрымлівае карту з выявай манаха, за якога будзе «хварэць», пры гэтым рабіць хады можна любымі манахамі. На працягу гульні мы павінны па магчымасці ратаваць свайго манаха (зрэшты, для гэтага яго можна падстаўляць пад «падазрэнні»), але ніхто не павінен здагадацца, што гэта за манах. У канцы фігурка, супраць якой набярэцца найбольш «улік», трапляе пад суд інквізіцыі. Шчыра кажучы, спачатку даволі складана разабрацца, што да чаго, і запомніць усе правілы ды акалічнасці. Але ў выніку я захапляюся, пачынаю прадумваць варыянты хадоў. Мне выпадае карта з аранжавым манахам, і, напэўна, навічкам шанцуе — мая фігурка не трапляе ў вогнішча інквізіцыі. Цікава, што ніводзін з партнёраў па гульні не здагадаўся, што мой манах — аранжавы, затое большасць чамусьці вырашыла, што я «хварэю» за шэрага манаха. У выніку самым «падазроным» аказваецца чырвоны манах, які «належыць» сівавалосаму мужчыне ў акулярах.

...На фестывалі праходзяць турніры па картачных, ваенных і настольных гульнях, прычым, у розных фарматах. Некаторыя вызначаюцца так званым «топам», калі спачатку гуляюць усе, а пасля застаюцца толькі лепшыя ігракі. Ёсць і «асабісты» залік: тых, хто перамагае ў большай колькасці гульняў, абвяшчаюць пераможцамі. У спаборніцтвах можа ўдзельнічаць любы ахвотны, для гэтага трэба толькі папярэдне зарэгістравацца ў арганізатараў.

...Падчас спаборніцтваў удзельнікі забываюцца на ўсё, для іх існуе толькі гульня. І яшчэ — жаданне стаць лепшым.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота аўтара.

Тут сціраюцца межы

ПА ДОБРЫ НАСТРОЙ У... «АНТЫКАВЯРНЮ»

У кожным горадзе ёсць месцы са сваёй адмысловай атмасферай. З часам яны становяцца культавымі. Пра іх звычайна прынята распавядаць сябрам за кубкам гарбаты: «А памятаеш, як узімку мы забягалі грэцца ў кавярню на «Дынама»?» ці «Які круты канцэрт быў на тыдні ў «Графіці»!». Такую славу можа займець і антыкавярня «Дом Фішара», якая адчынілася ў сталіцы непадалёку ад парку Чалюскінцаў.

Свабодная прастора

Рэстаратары па ўсім свеце даўно эксперыментуюць з сістэмай аплаты за свае паслугі. Напрыклад, у Вене ёсць кавярня, дзе наведнікі могуць заказаць колькі заўгодна страў з меню і заплаціць за іх, колькі палічаць неабходным. А ў лонданскай кавярні «Sew Over It» можна нават навучыцца... шыць. Наведніцам прапануюць гарбату, каву і кексы ў неабмежаванай колькасці, а таксама швейную машынку і кансультанта па шыцці. Аплата пагадзінная — 5 фунтаў за 60 хвілін.

Ідэя антыкавярняў зарадзілася ў Маскве, дзе ў 2010 годзе малады пісьменнік Іван Міцін адкрыў незвычайнае месца — «Дом на дрэве». Тут кожны мог выпіць гарбаты і прасядзець увесь дзень з кніжкай, а на выхадзе пакінуць суму, якую не шкада. Аднак хтосьці пакідаў 100-200 рублёў, а хтосьці — толькі 10. Таму з цягам часу цяжка стала плаціць за арэнду, і пісьменнік увёў фіксаваную сістэму аплаты: хвіліна — рубель. Так пачыналася гісторыя сеткі кавярняў «Цыферблат», якія зараз можна знайсці ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Кіеве, Адэсе і іншых гарадах.

Міцін стаў называць сваё месца «свабоднай прастораі». А тэрмін «антыкавярня» з'явіўся пазней, яго прыдумалі канкурэнты «Цыферблата».

Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

Хто ў доме гаспадар?!

Першая мінская антыкавярня, дарэчы, таксама ўжо паспела змяніць назву. Спачатку месца называлася «Гадзіннік Фішара» — у шахматах гэта спецыяльны таймер, які дазваляе ўдзельніку назапашваць секунды за кожны зроблены ход. Але, мусіць, заснавальнікі захацелі змясціць акцэнт на атмасферу гэтага месца, дзе кожны зможа адчуць сябе як дома. Знайшлі каларытную ляльку — старога, якога маглі званаць Фішар, і вырашылі, што гэта і ёсць гаспадар дома.

Зараз «Дом Фішара» складаецца з асноўнай залы, двух пакойчыкаў для невялікіх кампаній, гульнявой з прыстаўкай X-box і ўтульнай кухні, дзе кожны сам сабе гаспадар. Гарбата на любы густ, кава, разнастайныя прысмакі (ліманд, імбір, мёд) і, безумоўна, салодкае — печыва, вафлі, зефір, дбайна раскладзеныя адміністратарамі па хрустальных вазачках. І, як прадугледжвае фармат месца, ніякіх абмежаванняў на пачастункі!

На стэлажах шмат настольных гульняў — ад любімага многімі «Тэтрыса» да моднай «Манаполіі». Гульнятэка «Дома Фішара», дарэчы, карыстаецца асаблівай папулярнасцю.

Дарэчы, сюды дазваляецца прыходзіць з уласнай ежай і напоямі, пад забаронай толькі алкаголь. Таксама нельга курыць.

Крэатыў вітаецца!

На пытанне, у чым спецыфіка падобных месцаў, адміністратары мінскай антыкавярні адказваюць: «Гэта месца для творчасці! Для любой яе праявы. Сюды можна прыйсці пачытаць ці самому нешта папісаць. Нароўні са звычайнымі наведнікамі да нас заходзяць маладыя паэты, мастакі і музыканты. Ім тут утульна, кажуць, што сама атмасфера спрыяе творчасці».

Атмасфера тут і сапраўды незвычайная. Столькі артыфактаў у адным месцы я не бачыла нідзе! Пласцінкі з музыкай 80-х, кнігі, часопісы, лялькі, розныя статуэткі, амаль што рарытэтныя падсвечнікі і люстэркі... На стэлажах шмат настольных гульняў — ад любімага многімі «Тэтрыса» да моднай «Манаполіі». Гульнятэка «Дома Фішара», дарэчы, карыстаецца асаблівай папулярнасцю.

На ўваходзе ў асноўную залу стаіць шафа для буккросінгу — абмену кнігамі. Любы наведнік антыкавярні можа пазычыць выданне, якое яго зацікавіла, ці пакінуць сваю любімую кніжку, якой хоча падзяліцца з іншымі. А для аматараў памаляваць ёсць спецыяльная сценка, адведзеная пад роспіс. Яна нагадвае школьную дошку, і крэйда — побач: бярэш каляровы кавалачак і малюеш, што душы заўгодна. Адміністратары сварыцца не будуць, праверана на сабе.:)

Зазірнем у афішу

Яшчэ антыкавярня — гэта выдатная пляцоўка для ўсялякіх вечарын і імпрэз. У афішы «Дома Фішара» ўжо ёсць некалькі пастаянных мерапрыемстваў. Напрыклад, кожную нядзелю тут праводзяцца «Хуткія сустрэчы» — гульня, падчас якой удзельнікам даецца па 5 хвілін для знаёмства з суседам па століку. Так за адзін вечар можна набыць некалькі новых сяброў. У нядзелю тут гуляюць у «Мафію». Для кінаманаў праводзяцца сумесныя прагляды цікавых фільмаў. А тыя, хто ў дзяцінстве захапляўся тэлеперадачай «Ачумелыя ручкі», могуць наведваць майстар-класы па арыгамі ці хэндмэйду.

У госці да Фішара часта прыходзяць цікавыя асобы — каўчсёрферы (вандроўнікі па абмене), прамоўтары, дызайнеры, якія дзеляцца з наведнікамі кавярні сваім вопытам. Дарэчы, на адным з такіх трэнінгаў, куды мяне запрасіла сяброўка, я і пазнаёмілася з гэтым цудоўным месцам. Калі я запытала, куды мы ідзём, прыяцелька адказала: «У месца, дзе сціраецца мяжа паміж сваім і чужым, дзе завесці знаёмства прасцей простага, дзе з плячэй спадае ўвесь паўсядзённы цяжар, і ты адчуваеш сябе свабодна». Адчуванне свабоды па тарыфе 300 рублёў — за хвіліну... Здаецца, нядорага.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

У «ВАНІЛЬКІ» Я ПАЙДУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Каб атрымаць тлумачэнне, у чым жа сутнасць «ванільнасці» і навошта ўвогуле гэта трэба, вырашыла звярнуцца па дапамогу да знаёмых падлетка. «Што ты, ніякая я не «ванілька», — адказвала суседка майго сябра. «Я нават і не ведаю, што гэта, таму нічога расказаць не змагу», — гэта ўжо шаснаццацігадовая стрыечная сястра, якая раз-пораз выкладвае ў сацыяльнай сетцы досыць «ванільныя» здымкі. Карацей, ці то з мяне ідэнтыфікатар «ванільнасці» дрэнны, ці то ў нас насамрэч бракуе такіх далікатных паненак, якія, акрамя знешніх атрыбутаў, яшчэ і «ванільнай» філасофіі жыцця прытрымліваюцца, але атрымаць колькі слоў пра жыццё-быццё ад айчыннай прадстаўніцы гэтай субкультуры не ўдалося. Выручылі «замежніцы». Карына Какушына і Анжаліка Свістун жывуць ва ўкраінскім горадзе Чырвонаармейску, вучацца ў школе. Дзяўчаты лічаць сябе сапраўднымі «ванількамі» і могуць патлумачыць усім, хто цікавіцца гэтым рухам, як апранацца, што слухаць і ў чым заключаецца «ванільны» сэнс жыцця. Дзяўчаты стварылі сваю суполку ў сацыяльнай сетцы, і цяпер іх парады чытаюць больш за 12 тысяч удзельнікаў.

— Ванількі любяць пастэльныя колеры: бэжавы, персікавы, ружовы. Абавязковая дэталь макіяжу — паболей светлага танальнага крэму. Любімая музыка — Morcheeba, Sade, Emily Wells, а з рускамоўных — Земфіра (самая крутая песня — «Неба Лондана»), Марсэль, Мачэтэ, Loc Dog. А таксама амерыканскі спявак Джасцін Бібер, — піша Анжаліка.

Мяркуючы па шматлікіх пытаннях, якія Карыне і Анжаліцы дасылаюць, «ванількамі» жадаюць стаць многія падлеткі. І нават непакоіцца, каб у іх усё было «па правілах».

«Я апранаюся, як «ванілька», слухаю рамантычную музыку, фатаграфуюся на вялікі прышпільны фоцік, але не слухаю Джасціна Бібера, п'ю какаву, не куру. Мне ж толькі 12 гадоў», — непакоіцца ўдзельніца суполкі Насця.

Ванількі любяць пастэльныя колеры: бэжавы, персікавы, ружовы. Абавязковая дэталь макіяжу — паболей светлага танальнага крэму. Любімая музыка — Morcheeba, Sade, Emily Wells, а з рускамоўных — Земфіра (самая крутая песня — «Неба Лондана»), Марсэль, Мачэтэ, Loc Dog. А таксама амерыканскі спявак Джасцін Бібер

Ёй тут жа адказваюць:

«Нічога страшнага. Гэта твая справа, слухаць Бібера ці не. Пачытай, што напісана вышэй. Там ёсць і іншая музыка, якая падыходзіць «ванількам».

Яшчэ дзяўчат цікавіць, у якім узросце можна далучыцца да субкультуры, ці можна замяніць танальнік пудрай і галоўнае — ці бываюць сярод «ванілек» хлопцы. Наконт апошніх «эксперты» Карына і Анжаліка ўпэўнена даюць станоўчы адказ, а заадно — колькі фотаздымкаў у якасці прыкладаў. На іх — хударлявыя хлопцы ў майках з яркімі прынтамі, у стыльных акулярах і з і пышнай прычоскай. Ці слухаюць яны, як і дзяўчаты, рамантычныя песні, ці сумуюць, седзячы на падаконніку з кубкам кавы і цыгарэтай і гледзячы на дождж, не ўдакладняецца. Усё ж «ванількі» — пераважна дзявочы рух.

Здавалася б, які мілы стыль жыцця... Але не ўсё так соладка ў «ванільным» свеце.

«Я вырашыла стаць «ванількай», — піша школьніца Дарына з горада Харкава. — Мама купіла мне вялікі фоцік, кашулю з брытанскім сцягам, джынсы (таксама са сцягам). Мама ведае, што я куру. Яна набывае для мяне цыгарэты з ванільным смакам. Нядаўна я купіла стыльныя акуляры. Яны мне пасуюць! Але ж у класе мяне ўсе перасталі любіць і паважаць. Толькі адна сяброўка разумее».

Але «ванількі» сваіх не кідаюць!

«Калі табе камфортна быць «ванількай», будзь ёй. Раскрывай сваю душу, — супакойвае дзяўчынку «ванільны» хлопец па імені Аляксандр. — Мне 22 гады, і мне камфортна ў такім вобразе. Да думкі шэрай масы не трэба прыслухоўвацца».

Аляксандр, дарэчы, аказаўся зусім не падобным да тых узораў хлопцаў-«ванілек», якія прапаноўвалі Карына і Анжаліка. Што ж, можа, «ванільнасць» заключаецца ў светапоглядзе?

Якраз яго асаблівасці і выклікаюць найбольш спрэчак:

«Ванілька» шмат чытае, а не сядзіць гадзінамі «УКантакце»... «Зборышча ідыётак, якія маральна дэградуюць»... «Вы ўсе дурніцы, слухайце нармальную музыку»...

Кантраст відавочны. Пішуць жа і прыхільнікі, і праціўнікі. На адрас дзяўчат-аматарак «пяшчотных» адценняў, кавы і рамантычнай музыкі пішуць не проста негатыўныя водгукі, а часам нават нецэнзурныя. Іх пакінем у спакоі, а вось адзін, пазітыўны, варты, як нам падаецца, асаблівай увагі.

Яшчэ дзяўчат цікавіць, у якім узросце можна далучыцца да субкультуры, ці можна замяніць танальнік пудрай і галоўнае — ці бываюць сярод «ванілек» хлопцы.

«Ванількі» супраць таго, каб жанчыны насілі вульгарнае адзенне... Яны вераць у сапраўднае каханне і чакаюць свайго прынца», — піша чатырнаццацігадовая Яна.

Эх, Яна, Яна... Такія «ванількі» на свеце былі заўжды, і, здаецца, ім не наканавана знікнуць. Зрэшты, калі ў бацькоў ёсць грошы на матэрыяльныя атрыбуты «ванільнасці», а менавіта «фоцік», стыльнае адзенне і кілаграмы танальнага крэму, — то прыналежнасць да гэтай субкультуры не павінна прынесці ніякіх негатыўных наступстваў. Праўда, усё ж варта «біць па руках» за ванільныя цыгарэты і часам цікавіцца, пра што ж думае, седзячы на падаконніку, юнае пяшчотнае стварэнне... Што ж да астатняга — яно ўжо прыжылося: на вуліцах — безліч асоб, якія прытрымліваюцца «ванільнага» стылю, у інтэрнэце — сотні гігабайтаў з іх фоткамі. Па гэтых акулярах, высока завязаных валасах і вузкіх штанах у спалучэнні з угамі, відаць, будуць пазнаваць наша дзесяцігоддзе, як сямідзясятыя пазнаюць па штанах-клёш, а васьмідзясятыя — па любові да рознакаляровых легіксаў і сілуэтах з шырокімі плячыма?..

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота з інтэрнэту.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
21 03 2013 г.

ОАО «МИНСКИЙ ПОДШИПНИКОВЫЙ ЗАВОД»

Учетный номер плательщика: **100103346**
Вид экономической деятельности:
производство подшипниковой продукции
Организационно-правовая форма:
Открытое акционерное общество
Орган управления: **ОАО «БМЗ – УПРАВЛЯЮЩАЯ КОМПАНИЯ ХОЛДИНГА «БМЗ»**
Единица измерения: **млн. руб.**
Адрес: **220026, г. Минск, ул. Жилуновича, 2**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2012 г.

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	456 471	330 783
Нематериальные активы	120	27	39
Доходные вложения в материальные активы	**130**	**8 914**	**-**
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
